АД ДЭМЕНЦЫІ НЕ ЗАРАКАЙСЯ 7

НАВОШТА ВОЖЫКУ БАТАРЭЙКА 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЛІСТАПАДА 2019 г. АЎТОРАК № 224 (29091)

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар НІКАЛАЙКІН, старшыня Віцебскага гарвыканкама, абраны дэпутат Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання:

«Упэўнены, што работа парламента новага склікання будзе сканцэнтравана на тых момантах, якія найбольш хвалююць сёння людзей, дзе ёсць недапрацоўкі, накіравана на развіццё грамадства і ўдасканаленне заканадаўства. Наша задача — паляпшаць і разам з урадам выпрацоўваць тыя законы, якія патрэбныя краіне і людзям. Таму што нават на месцах часта мы сутыкаемся з нейкімі непераадольнымі перашкодамі... і, каб вырашыць элементарнае пытанне, трэба пераадолець валакіту, правесці вялікую папяровую работу».

КАРАТКА

- **Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў кастрычніку 2019 года склала Br1123,4.**
- ДАІ рэкамендуе не чакаць 1 снежня і ўжо зараз пераабуваць аўто ў зімовыя шыны, а таксама перастройвацца на зімовы стыль кіравання.
- **У Гомелі пачаў курсіраваць «Аўтобус прадказанняў». У яго салоне размешчаны элементы беларускага арнаменту з іх расшыфроўкай.**
- У гарадскім пасёлку Целяханы (Брэсцкая вобласць) на адным з падворкаў уведзены двухмесячны каранцін з-за шалёнага янота.
- **Пракуратура Брэсцкай вобласці з пачатку года прад'явіла да выпускнікоў, якія не адпрацавалі належны тэрмін па размеркаванні, 131 іск на суму больш за Br509 тыс.**

ISSN 1990 - 763X

МІР СЛУХАЕ РАЖОК З АДЭЛЬСКА

Рэдка якое народнае свята ў Гродзенскай вобласці, а тым больш фестывалі народных промыслаў і мастацкіх вырабаў, фальклорныя гулянні рэгіёнаў Панямоння і суседніх раёнаў, абыходзіцца без удзелу вядомага майстра па вырабе музычных інструментаў, жыхара вёскі Адэльск — Мар'яна СКРАМБЛЕВІЧА. Са сваімі дудкамі і свістулькамі, ражкамі і акарынамі, флейтамі і жалейкамі Мар'ян Антонавіч упрыгожыць любое свята. Носьбіт аўтэнтычнага рамяства і яго шматлікія інструменты-самаграі выклікаюць непасрэдную цікавасць у кожнага чалавека, асабліва калі майстар апавядае пра той ці іншы інструмент, калі прыкладвае дудку альбо ражок да вуснаў і незвычайнымі гукамі агалошвае святочную прастору. Сем гадоў таму творчасць Мар'яна Скрамблевіча была ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Гэты здымак зроблены ў дворыку сярэднявечнага замка ў пасёлку Мір, дзе славуты майстар неаднойчы дэманстраваў сваю музычную калекцыю.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Традыцыі малой радзімы

ГУСЬ У МЕТАЛЕ

У Белай Дуброве ўшанавалі самую папулярную ў аграгарадку птушку і адкрылі ёй помнік

Мароз у восем градусаў жорстка шчыпаў за шчокі, нос, рукі, але гэта не перашкодзіла жыхарам Белай Дубровы, што ў Касцюковіцкім раёне, і іх гасцям адзначыць вясёлае народнае свята ў духу старадаўніх кірмашоў. Раней вёска, а сёння перспектыўны аграгарадок, заўсёды славілася сваімі гусінымі гаспадаркамі. Старажылы кажуць, што былі часы, калі ўся Бесядзь, адна з галоўных рэчак Касцюкоўшчыны і сапраўднае ўпрыгажэнне гэтага населенага пункта, была белая ад вялікай колькасці гусей. Жыццесцвярджальнае «га-га-га» і сёння даносіцца з тутэйшых падворкаў. А значыць, ёсць нагода для вясёлага фестывалю.

СТАР. 5

Жыллё маё

МАЛАПАВЯРХОВЫЯ ДАМЫ АБСТАЛЮЮЦЬ ЛІФТАМІ

Праўда, датычыцца гэта толькі новых дамоў, якія будуюць, паведаміла начальнік Галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Вольга ВЕРАМЕЙ.

Цяпер такое патрабаванне не з'яўляецца абавязковым, таму ў будынках да пяці паверхаў не прадугледжаны ліфтавыя шахты. Сёння па нормах ліфты ўсталёўваюцца ў будынках, вышэйшых за 14 метраў. Пяціпавярхоўкі не траплялі ў гэтыя правілы, але сёння такое патрабаванне ўводзіцца: нават калі ў будынку тры паверхі, усё роўна ён будзе абсталяваны ліфтам.

Пасля зацвярджэння будаўнічай нормы «Жылыя будынкі» пры будаўніцтве і рэканструкцыі дамоў, незалежна ад іх павярхавасці, будзе ствараць безбар'ернае асяроддзе. Пры распрацоўцы новых нормаў спецыялісты Мінбудархітэктуры атрымалі даручэнне, каб і вертыкальныя, і гарызантальныя камунікацыі былі безбар'ерныя — каб кожны чалавек, які страціў здольнасці да перамяшчэння, мог адчуваць сябе камфортна ў сваёй кватэры, пад'ездзе, доме. «У прыватнасці, пастаўлена задача, каб у шматкватэрных блакіраваных жылых дамах, якія будуюцца для грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, або іншых катэгорый грамадзян, былі ліфты», — адзначыла Вольга Верамей.

СТАР. 4

АГУЛЬНАГА БОЛЬШ, ЧЫМ ЗДАЕЦЦА

Такую думку выклікае візіт кіраўнікоў скандынаўскіх знешнепалітычных ведамстваў у Беларусь

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з міністрам замежных спраў Швецыі Ан Ліндэ і міністрам замежных спраў Фінляндыі Пека Хаавіста. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка адзначыў падабенства эканомік і менталітэту трох краін.

Вітаючы міністраў, Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь моцна зацікаўлена ў выбудоўванні ўзаемапаважлівых і добрасуседскіх адносін не толькі з Еўрапейскім саюзам у цэлым, але і са Швецыяй і Фінляндыяй у прыватнасці.

«Для нас вы з'яўляецеся ў пэўным сэнсе ўзорам гаспадарання. Мы вельмі падобныя на вашы краіны — у нас падобная эканоміка і, галоўнае, працавітыя, моцныя людзі. Нашы краіны не маюць велізарных матэрыяльных рэсурсаў, але стараюцца жыць за кошт працы сваіх рук і розуму сваіх людзей. І, шчыра кажучы, у нас шмат атрымліваецца — у вас больш, у нас, магчыма, пакуль крыху меней. Але, я спадзяюся, вы нам падкажаце, у якім кірунку рухацца — перш за ўсё ў эканоміцы. У нашых агульных інтарэсах, каб наш рэгіён стаў аазісам міру, спакою і росквіту. Гэта галоўнае. Будзе гэта — будзем багаты, будуць жыць нармальна нашы народы», — абазначыў сваю непахісную пазіцыю беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускаму боку цікавы перадавы вопыт Еўрасаюза ў многіх сферах. Але для пачатку неабходна завяршыць працэс фарміравання дагаворна-прававой базы, падпісаць падрыхтаваныя дакументы.

«Калі мы ўжо выпрацавалі адпаведныя дагаворы, прыйшлі да разумення таго, што нам трэба іх падпісваць, цягнуць з гэтым не варта. Вы бачыце, што вакол нас творыцца. Малыя і сярэднія дзяржавы мусяць неяк бліжэй быць адна да адной, аб'ядноўвацца, калі гэта магчыма, каб устаяць у гэтым цяжкім бурлівым свеце», — упэўнены Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў шведскія і фінскія кампаніі да рэалізацыі ў Беларусі праектаў у галіне транспарту і лагістыкі, а таксама ў сферах аднаўляльнай энергетыкі, аховы навакольнага асяроддзя і энергаэфектыўнасці. Прэзідэнт прапанаваў падтрымаць праекты па перапрацоўцы адходаў, развіцці альтэрнатыўных крыніц энергіі.

Сур'ёзныя перспектывы мае супрацоўніцтва ў лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Дзякуючы зручным транспартным зносінам ёсць магчымасць пастаўляць выраблену ў Беларусі прадукцыю на рынкі Еўропы і Азіі.

«Ужо больш за дзесяць гадоў па маім патрабаванні нашы спецыялісты прыглядаюцца, як вы гаспадарыце ў лясах, ажыццяўляеце дрэваапрацоўку. Нашы спецыялісты, міністры далёка наперад прасунуліся, і вы ўжо, дыпламаты, адстаяце ад іх. Бізнес, эканоміка ўсё роўна ідуць наперадзе. Яны шукаюць найлепшыя месцы, найлепшыя ўмовы, каб працаваць і супрацоўнічаць», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Фіны і беларусы — менталітэт яднае

Гэта другая сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з міністрам замежных спраў Фінляндыі. У 2008 годзе Аляксандр Стуб быў у Мінску як старшыня АБСЕ, а сёння Пека Хаавіста выконвае адказную функцыю старшыні ў Савеце Еўрапейскага саюза.

«Фінляндыя, як і Беларусь, не мае значных прыродных рэсурсаў, але самастойна, упартасцю і працавітасцю, дамаглася прыкметнага прагрэсу. Фіны па менталітэце вельмі падобныя на беларусаў. Менавіта таму вы добра разумееце працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне. Гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ў падтрымцы Фінляндыяй суверэнітэту і незалежнасці Беларусі ў рамках ініцыятывы Усходняга партнёрства», — падкрэсліў Прэзідэнт.

З улікам запуску АЭС, які мае адбыцца ў 2020 годзе, Беларусі цікавы вопыт фінскага боку па забеспячэнні бяспекі атамнай электрастанцыі «Ханхіківі-1», якая будуецца. Тым больш што фінляндская станцыя ўзводзіцца па аналагічным праекце і тым жа расійскім падрадчыкам.

Беларусь—Швецыя: новая старонка

Беларускі лідар падзякаваў міністру замежных спраў Швецыі Ан Ліндэ за ініцыятыву правядзення такога сумеснага візіту.

«У нашай найноўшай гісторыі былі нялёгкія эпізоды, але мы здолелі іх пераадолець і адкрылі новую старонку ў адносінах. Думаю, што ў гэтым кірунку і будзем развіваць нашы адносіны», — звярнуўся да госці Прэзідэнт.

Беларускі бок вітае актыўнасць кампаній са Швецыі на беларускім напрамку. Напрыклад, канцэрн IKEA прыняў стратэгію «Наперад у Беларусь» па нарошчванні закупак нашай прадукцыі да трохсот мільёнаў еўра.

Супрацоўніцтва «Сканіі» і БелАЗа па пастаўках рухавікоў дапамагае беларускай тэхніцы выходзіць на рынак Еўрасаюза. Газавыя турбіны з Швецыі забяспечаць стабільнасць энергасістэмы пасля ўводу АЭС. Брэнд адзення H&M пачаў ствараць у нас поўнамаштабную гандлёвую сетку.

«Наша партнёрства спрыяе мадэрнізацыі эканомікі, замацаванню на новых рынках. Бізнес працуе ў правільным кірунку. Давайце падтрымліваць гэты рух», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка і запрасіў падумаць, што бакі могуць зрабіць, каб візіт у такім фармаце надаў імпульс развіццю адносін Беларусі з усёй Паўночнай Еўропай.

У Мінску заўсёды рады бачыць палітыкаў разам з калегамі з Нарвегіі, Данii, Ісландыі, нагадаў Прэзідэнт.

Варвара МАРОЗАВА.

У тэму

Пасля перагавораў у Палацы Незалежнасці і Міністэрстве замежных спраў кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў Беларусі, Швецыі і Фінляндыі сустрэліся з журналістамі і расказалі пра асноўныя вынікі візіту.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей назваў яго ўнікальным, таму што ўпершыню нашу краіну наведваюць два міністры замежных спраў з рэгіёна Паўночнай Еўропы і Балтыйскага мора і ўпершыню з 1992 года ў Мінск прыехаў кіраўнік МЗС Швецыі.

Міністр замежных спраў Швецыі Ан Ліндэ адзначыла, што яе краіна зацікаўлена ў дыялогу з Беларуссю. Яна аб'явіла, што сёння рэкамендавала змяніць у сваёй краіне найменне «Белая Расія» на «Беларусь». Найбольш зацікаўлены шведскі бок у развіцці гандлёвых адносін, кантактаў паміж людзьмі. Пры гэтым Ан Ліндэ звярнула ўвагу, што патэнцыял двухбаковых адносін пакуль недастаткова рэалізаваны.

Пека Хаавіста, міністр замежных спраў Фінляндыі, адзначыў, што кампаніі з гэтай краіны цікавяцца сувязямі з Беларуссю. «Вядома сітуацыя з БелАЭС — мы ведаем аб заклапочанасці Літвы ў гэтай сферы. Мы запрасілі экалагічных экспертаў з Беларусі, Фінляндыі і Літвы, каб абмеркаваць гэтае пытанне ў трохбаковым фармаце», — паведаміў міністр.

У размове з журналістамі Уладзімір Макей выказаў сваю пазіцыю адносна негатыўнай ацэнкі выбараў назіральнікамі АБСЕ: «Хацеў бы яшчэ раз падкрэсліць: мы былі абсалютна адкрытыя ў правядзенні гэтых выбараў. Больш за тысячу назіральнікаў, якія прадстаўляюць розныя арганізацыі і краіны, мелі магчымасць назіраць за гэтым працэсам абсалютна адкрыта і даступна на ўсіх участках. Дарэчы, не ва ўсіх краінах нават Еўрасаюза ёсць адпаведныя магчымасці для арганізацыі міжнароднага назірання за выбарамі». Ён дадаў, што нельга прыязджаць на выбары з загадзя сфарміраванымі поглядамі і здагадкамі.

Пацікавіліся журналісты поглядамі дыпламатаў на ініцыятыву беларускага Прэзідэнта аб правядзенні сустрэчы «Хельсінкі-2». «Пра перспектывы зоны бяспекі АБСЕ і пра будучыню розных ініцыятыў у яе рамках казаць і абмяркоўваць гэтыя рэчы, пакуль не будзе ўрэгуляваны канфлікт ва Украіне, крыху рана, — заўважыў Пека Хаавіста. — Гэты крок павінен рушыць услед за выкананнем мінскіх пагадненняў і поўным урэгуляваннем канфлікту на Данбасе».

Марыя ДАДАЛКА.

МОЖАМ НАБЫЦЬ ВЫХАД ДА МОРА

Прэзідэнт падтрымаў ідэю стварэння партовых магутнасцяў у Калінінградскім рэгіёне

І беларусы, і калінінградцы імкнуцца да ўзаемавыгаднага, плённага супрацоўніцтва. Пра гэта красамоўна сведчыць новы візіт расіян на чале з кіраўніком вобласці, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Для Беларусі Калінінградская вобласць — не толькі важны і перспектыўны гандлёва-эканамічны партнёр, гэта адзін з самых блізкіх геаграфічна і гістарычна рэгіёнаў Расіі. Губернатар вобласці Антон Аліханаў упершыню наведаў Мінск два гады таму. Тая сустрэча надала новы імпульс двухбаковаму ўзаемадзеянню. А сёння беларускі лідар выказаў спадзяванне, што новы візіт дазволіць яшчэ лепш пазнаць нашу краіну і яе магчымасці.

«Патэнцыйных пунктаў росту ў нас дастаткова. Добры прыклад выніковасці вашых інвестыцый у беларускую эканоміку — запуск кампаніяй «Садружнасць» маслаэкстракцыйнага завода ў Смаргоні. Ён вельмі паспяхова працуе. Яго прадукцыя дазволіла істотна павялічыць аб'ём тавараабароту», — задаволены Прэзідэнт.

Яшчэ адзін прыклад эфектыўнага ўзаемадзеяння — Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў, які рэалізуе праект па ўдзеле ў праграме лакалізацыі на прадпрыемстве «Аўтатор Холдынг».

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка разлічвае на больш цесную кааперацыю беларускіх і расійскіх машынабудаўнікоў. Напрацовак у гэтай галіне дастаткова: мінскія аўтобусы з поспехам эксплуатуюцца ў Калінінградскай вобласці, ёсць магчымасць пашырыць парк пасажырскай тэхнікі за кошт сучаснага экалагічнага транспарту — электробусаў «Белкамунмаш». Адна з традыцыйных сфер, дзе наладжана паспяховае супрацоўніцтва, — будаўніцтва. Самы паказальны вынік сумеснай работы — пабудова да чэмпіянату свету па футболе ў 2018 годзе стадыёна ў Калінінградзе. Гараджане і госці горада ацанілі па заслугах і прафесіяналізм беларускіх спецыялістаў, і якасць нашых сучасных будматэрыялаў.

Сёння ў Калінінградскай вобласці рэалізуецца шэраг буйных інфраструктурных праектаў — будаўніцтва марскога порта, калійнага камбіната, музейнага комплексу, Прыморскага кольца. Беларусь гатова ўдзельнічаць у гэтых будоўлях, у тым ліку праз пастаўку грузавых, дарожных, камунальных і будаўнічых машын.

Летась па аб'ёме двухбаковага гандлю мы наблізіліся да рэкорднай меткі — 360 мільёнаў долараў. «Самы час ставіць больш амбіцыйныя задачы. Перш за ўсё ў прамысловай сферы і па лініі вытворчай кааперацыі. Галоўнае, што да гэтага імкнуцца і Беларусь, і Калінінградская вобласць. Больш за тое, ёсць канкрэтныя праекты, якія дазваляюць значна пашырыць маштабы супрацоўніцтва», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што беларускі бок заўсёды дакладна, якасна і аператыўна выконвае ўсе дамоўленасці.

Антон Аліханаў паведаміў, што ў прамысловым узаемадзеянні Беларусі і Калінінградчыны рэалізуецца праграма лакалізацыі, у тым ліку па аўтамабілях «Хёндэ», «Kia». З трэцяга квартала гэтага года новыя сучасныя аўтамабілі вырабляюцца з удзелам беларускіх тэхналогій на беларускі, расійскі рынкі і на рынак ЕАЭС.

«Аляксандр Рыгоравіч вельмі пазітыўна адрэагаваў на ідэю стварэння партовых магутнасцяў у Калінінградскай вобласці. Спадзяёмся, што гэта таксама стане адной з тэм для размовы на найвышэйшым узроўні. Для нашага рэгіёна вельмі важна замацаванне нейкага спецыфічнага тавараратоку з Беларусі на захад праз Калінінградскі порт», — паведаміў журналістам Антон Аліханаў па выніках размовы з Прэзідэнтам.

Пасля сустрэчы ў Палацы Незалежнасці адбылося XVI пасяджэнне Беларуска-Расійскага Савета па доўгатэрміновым супрацоўніцтве, па выніках якога падпісаныя камерцыйныя кантракты.

Варвара МАРОЗАВА.

Знешняя палітыка

ВЫГАДНАЕ СУСЕДСТВА

Прэзідэнт Літвы настроены на актывізацыю супрацоўніцтва з Беларуссю

Пра гэта Гітанас НАЎСЕДА заявіў падчас сустрэчы з намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Ігарам ПЕТРЫШЭНКАМ.

Як адзначыў у размове з журналістамі віцэ-прэм'ер Беларусі, Прэзідэнт Літвы скіраваны на тое, што краіны павінны актывізаваць узаемадзеянне па ўсіх кірунках. Асабліва мае патрэбу ў другім дыханні эканоміка.

Таварасварот дынамічна развіваецца: за мільярд долараў ён выйшаў у 2018-м, і пазітыўны настрой па лічбах бягучага года. «Плюс 30 % нашых грузаў, транспарціроўка якіх ажыццяўляецца праз Клайпедскі порт. Гэтая тэма таксама абмяркоўвалася. Мы дамовіліся, і гэта было пацверджана Прэзідэнтам, што адновім правядзенне эканамічных форумаў, якія традыцыйна праводзіліся і ў Літве, і ў Беларусі», — паведаміў віцэ-прэм'ер.

Чарговы такі форум, па яго словах, адбудзецца ў Клайпедзе 20 мая 2020 года.

Прэзідэнт Літвы цікавіўся і інвестыцыйнымі праектамі з нашай краінай, — у гэтай сувязі згадвалі Індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Не абышлі і пытанні гуманітарнага кірунку — адукацыю, медыцыну, навуку і культуру. «Актывізуем падрыхтоўчыя мерапрыемствы, каб ажыццявіць кантакты па лініі профільных ведамстваў і паступова ажывіць наша двухбаковае ўзаемадзеянне», — адзначыў намеснік кіраўніка ўрада.

Важна, на думку Ігара Петрышэнкі, зняць праблемы прапускной здольнасці граніцы, ёмістасці і магчымасцяў пунктаў «Каменны Лог» і «Мядзінінкай» з літоўскага боку: «Тут мы павінны сінхранізаваць (работу. — **«Зв.»**). Гэта было падтрымана Прэзідэнтам Літоўскай Рэспублікі — пашырэнне магчымасцяў: як пагранперахода і мытнага перахода з боку Літвы, так і з боку Беларусі.

Абмеркаваў вектары супрацоўніцтва Ігар Петрышэнка і з прэм'ер-міністрам Польшчы Матэвушам Маравецкім. Апошні цікавіўся пытаннямі развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза і яго ўзаемадзеяння з ЕС. «Ён выказаў жаданне, каб максімальная колькасць патокаў грузаў праз Польшчу, Беларусь, з Еўразійскага эканамічнага саюза і Кітая («Новы шаўковы шлях») ішла ў Еўропу. І адпаведна, з Еўропы — у Еўразійскі эканамічны саюз», — расказаў журналістам віцэ-прэм'ер.

Марыя ДАДАЛКА, *г. Вільнюс.*

Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання

6 снежня 2019 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (г. Мінск, вул. Савецкая, 11) пачне работу першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў — 6 снежня з 9.00 да 9.45.

Шчыры падарунак

НОВЫ АЎТОБУС — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Мінскай вобласці Ігар ЯЎСЕЕЎ ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыў ключы ад новага мікрааўтобуса «ГАЗель» Уздзенскаму раённаму цэнтру карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі для перавозкі дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Машына куплена за кошт раённага і абласнога бюджэтаў.

Памочнік Прэзідэнта Ігар ЯЎСЕЕЎ і дырэктар цэнтра Марына ПАЎЛОВІЧ.

Перадгісторыя гэтай падзеі наступная. На адным з прыёмаў грамадзян да Ігара Уладзіміравіча звярнулася маці, якая мае дзіця-інваліда. Жанчына паскардзілася, што машына, якая падвозіць выхаванцаў да цэнтра, часта выходзіць са строю.

— Мы вывучылі сітуацыю, я даў даручэнне начальніку ДАІ Мінскай вобласці высветліць, колькі гадоў гэтай машыне, які ў яе прабег, як часта яна становіцца на рамонт. Прааналізаваўшы ўсе параметры, зразумелі, што праблема сапраўды ёсць, аўтобус тэхнічна зношаны, — расказаў Ігар Яўсееў. — Мной і старшынёй Мінаблвыканкама Анатолем Ісачанкам было прынятае рашэнне аб неабходнасці набыць новую машыну.

Мікрааўтобус абсталяваны спецыяльным прыстасаваннем для замацавання інваліднай каляскі, электрычным пандусам-пад'ёмнікам, сядзеннямі з рамянямі бяспекі, месцам для суправаджаючага педагога, кандыцыянерам. А тэлевізар зробіць паездку маленькіх пасажыраў больш цікавай і захапляльнай.

— Я думаю, цяпер у дзяцей і іх бацькоў будзе праблем намнога менш. Я рады, што ў нас усё атрымалася. Сёння, наведаўшы ваш горад, яшчэ раз упэўніўся, што жыхары яго любяць, — прыемна праехацца па чыстых прыгожых вуліцах. Абмеркавалі мы са старшынёй райвыканкама і некаторыя іншыя аспекты развіцця горада і раёна. У прыватнасці, у райцэнтры няма басейна, жыхарам даводзіцца ездзіць у Стоўбцы. Будзем думаць над рашэннем, — рэзюмаваў Ігар Яўсееў.

— Мы разгледзім пытанне, каб на гэтай машыне дзеці з'ездзілі ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу. Давайце зробім для выхаванцаў цэнтра такі навагодні падарунак, — звярнуўся ён да начальніка ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таццяны Апраніч. — Я са свайго боку буду хадайнічаць, думаю, грошы знойдзем.

— Мы ўпэўнены, што новы аўтобус значна палепшыць якасць навучання і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей. А нашы ўзаемаадносіны з усімі суб'ектамі адукацыйнага працэсу выйдуць на новы ўзровень, — **сцвярджае дырэктар цэнтра Марына ПАЎЛОВІЧ.** — Новы транспарт дазволіць арганізаваць бесперабойную дастаўку дзяцей. Усяго ж у класе адзінаццаць выхаванцаў, чатыры з іх атрымліваюць спецыяльную адукацыю дома, семярых возім у цэнтр з розных населеных пунктаў раёна. Акрамя таго, нашы выхаванцы змогуць цяпер наведваць сваіх равеснікаў з Дзяржынска, Клецка, Капыля, Нясвіжа, з якімі сябруюць, праводзяць розныя мерапрыемствы, конкурсы, спаборніцтвы.

Дарэчы, установе 26 кастрычніка споўнілася 20 гадоў з дня заснавання. Так што ў педагогаў і выхаванцаў двайное свята.

Падарунак цэнтру — мікрааўтобус.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. Фота БелТА.

«АЛЕСІ» — 95!

Сёння часопіс «Алеся», які выходзіць у нашым Выдавецкім доме «Звязда», адзначае 95-годдзе выхаду першага нумара. Рашэнне аб стварэнні менавіта жаночага часопіса было прынята на I Усебеларускім з'ездзе работніц і сялянак у сакавіку 1924 года. Часопіс, які некалькі дзесяцігоддзяў насіў назву «Работніца і сялянка», быў папулярны і любімы не толькі ў Беларусі, але і ў іншых саюзных рэспубліках.

Са слаўным юбілеем выданне павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады існавання часопіс некалькі разоў мяняў назву, але не страціў сваёй сутнасці. Як і дзесяцігоддзі таму, ён паспяхова спрыяе паляпшэнню становішча жанчын у грамадстве, паказвае іх як актыўных удзельніц палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця краіны.

«Не будзе перабольшаннем сказаць, што «Алеся» сфарміравала некалькі пакаленняў беларусак — энергічных, адукаваных і адказных. Выданне і сёння робіць важкі ўнёсак у стварэнне светлага, высакароднага вобраза беларускай жанчыны, выхаванне нашай моладзі і папулярызацыю сямейных каштоўнасцяў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што творчы калектыў часопіса і надалей будзе верны сваім прафесійным абавязкам і добрым традыцыям. Ён пажадаў аўтарам і чытачам «Алесі» шчасця, дабрабыту і далейшых поспехаў на карысць роднай Беларусі.

Надвор'е

ВОСЬ І СНЕГ НА ГАЛАВУ

А ў пятніцу — з плюсам

У пачатку тыдня ўмовы надвор'я ў нашай краіне будзе вызначаць заходняя перыферыя антыцыклону з цэнтрам над сярэдняй Волгай, а разам з гэтым захаваецца халоднае без істотных ападкаў надвор'е.

А ў сярэдзіне тыдня надвор'е пачне мяняцца, і тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам атмасферных франтоў і цёплых паветраных мас, якія паступаюць з Заходняй Еўропы. Тэмпературны фон пачне павышацца, чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, месцамі туман і слабыя галалёдныя з'явы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Заўтра ў сераду ў асобных раёнах Беларусі чакаюцца невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Амаль паўсюдна слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 8 градусаў па ўсходзе да плюс 1 градуса па паўднёвым захадзе краіны, удзень — ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла. Таксама мокры снег з дажджом чакаецца і ў чацвер. Іх прынясуць да нас атмасферныя франты ўначы ў асобныя раёны, а ўдзень — на большую частку тэрыторыі краіны. Месцамі магчымыя слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы — ад нуля да мінус 6 градусаў, а ўдзень — ад мінус 2 да 4 цяпла. Па паўднёвым захадзе краіны ўначы будзе 1—3 цяпла, удзень — ад плюс 5 да плюс 7 градусаў. У пятніцу часова пацяплее. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай па паўночным усходзе чакаюцца дождж, мокры снег і слабы галалёд. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, толькі ўначы па паўночным усходзе пры праясненнях панізіцца да мінус 3 градусаў. Разам з тым удзень па паўднёвым захадзе краіны будзе 6—8 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу на большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, які будзе пераходзіць у мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, удзень чакаецца парывісты вецер. Тэмпература паветра удзень — ад мінус 1 градуса па паўночным захадзе краіны да плюс 5 градусаў па паўднёвым усходзе.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

Пасажыр цягніка пабіўся з касірам

І паражаў нажом міліцыянеру

Удзень у Жабінкаўскі РАУС паступіла паведамленне: у электрычцы Брэст — Баранавічы п'яны мужчына збівае білетнага касіра.

Канфлікт завязаўся пасля таго, як 45-гадовы пасажыр адмовіўся аплачваць праезд. Слоўная сварка скончылася бойкай, пасля якой безбілетнік выйшаў на станцыі Жабінка. Аператыўнікі Брэсцкага АУС на транспарце ўстанавілі асобу пасажыра і ўвечары таго ж дня прыехалі да яго дадому для ўдакладнення абставін таго, што адбылося.

Калі праваахоўнікі зайшлі ў кватэру, гаспадар пачаў іх абражаць, а затым схапіўся за кухонны нож. Сышчык дастаў табельную зброю і папярэдзіў пра намер яе выкарыстаць. Гэта спыніла мужчыну, ён раскаяўся ў зробленым і расказаў падрабязнасці таго, што адбылося ў цягніку. Цяпер праводзіцца праверка па факце гвалту альбо пагрозы яго прымянення ў дачыненні да службовай асобы, а таксама па факце гвалту альбо пагрозы яго прымянення ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў.

Вядома, што безбілетнік ужо трапляў у поле зроку супрацоўнікаў міліцыі і неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за дробны крадзеж, з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення і парушэнне ПДР.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі сустрэўся ў Токіа з імператарам Японіі

Папа Рымскі Францыск, які знаходзіцца з візітам у Японіі, сустрэўся ў панядзелак у Токіа з імператарам Японіі Нарухіта, перадае тэлеканал NHK.

Японскі імператар, адзеты ў чорны еўрапейскі гарнітур з гальштукам, выйшаў да машыны сустрэць пантыфіка, які прыбыў у палац, а пасля заканчэння сустрэчы праводзіў яго да аўтамабіля. Нарухіта стаў імператарам Японіі 1 мая гэтага года, пасля таго, як яго бацька Акіхіта перадаў яму трон у спадчыну. Раней Францыск выступіў з прамовай у Нагасакі і заклікаў свет адмовіцца ад ядзернай зброі. Пасля Нагасакі ён накіраваўся ў Хірасіму, на якую ўпершыню ў свеце ў 1945 годзе была скінутая ядзерная бомба. Гэта першае наведванне Францыскам Краіны ўзыходзячага сонца, папярэдні візіт кіраўніка каталіцкай царквы ў Японію адбыўся 38 гадоў таму.

Часовы прэзідэнт Балівіі падпісала закон аб усеагульных выбарах

Часовы прэзідэнт Балівіі Жанін Аньес падпісала закон аб усеагульных выбарах, прыняты напярэдадні абедзвюма палатамі парламента краіны, які адмяняе вынікі кастрычніцкіх выбараў і вызначае парадак і тэрміны правядзення новых. «З-за гэтага закона мы выйшлі на вуліцы», — заявіла падчас выступлення ў палацы Кемада палітык, словы якой прыводзіць Балівійскае інфармацыйнае агенцтва. Максімальны тэрмін, вызначаны законам для правядзення новых прэзідэнцкіх выбараў у Балівіі, складае 140 дзён: 20 дзён дэпутаты адвялі на выбары вярхоўнай калегіі Вышэйшага выбарчага суда і дадатковыя 120 — на арганізацыю і правядзенне галасавання, якое павінна прайсці не пазней за 12 красавіка. У тлумачэнні да законапраекта, апублікаваным сенатам Балівіі, гаворыцца, што ён забараняе выстаўляць свае кандыдатуры на выбарах асобам, якія раней займалі гэтую пасаду два тэрміны запар. Такім чынам, становіцца юрыдычна немагчымым удзел у маючых адбыцца выбарах экспрэзідэнта краіны Эва Маралеса.

Грамадзянін Малайзіі павешаны ў Сінгапуры за спробу ўвозу 16 грамаў наркотыкаў

У Сінгапуры прыведзены ў выкананне смяротны прысуд, вынесены грамадзяніну Малайзіі за кантрабанду наркотыкаў. Мужчыну судзілі пасля таго, як у яго канфіскавалі 16,56 грама гераіну. 36-гадовага Абд Холм Абд Халіма пакаралі смерцю праз павешанне ў галоўнай турме «Чанг», піша The Star. Іншаземец быў арыштаваны на граніцы, на сухапутным пагранічным пераходзе, у сакавіку 2017 года. Апошняе прашэнне аб памілаванні было адхілена сінгапурскім судом у ліпені гэтага года. На гэтым тыдні міністр у дэпартаменце прэм'ер-міністра Малайзіі па пытаннях юрыспрудэнцыі Лі Ву Кіёнг накіраваў уладам Сінгапура ноту з просьбай перагледзець гэтае рашэнне, аднак зварот застаўся без адказу. Памілаваць Халіма беспаспяхова прасіў і міністр юстыцыі Малайзіі. Незаконны абарот наркотыкаў з'яўляецца адным з найцяжэйшых злачынстваў у Сінгапуры, адзначае ТАСС. Паводле мясцовага заканадаўства, найвышэйшая мера пакарання пагражае за захоўванне, транспартаванне 15 грамаў гераіну або 30 грамаў какаіну.

К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «БелВитунифарм»

Внеочередное собрание акционеров состоится 17 декабря 2019 года в 12.00 по адресу: Витебская область, Витебский район, д. Должа, ул. Советская, д. 26А, актовый зал. Регистрация участников будет осуществляться по указанному выше адресу, время регистрации участников собрания пройдет в день проведения собрания с 9.00 до 11.45. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 1 декабря 2019 г.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ

	Формулировка вопроса повестки дня
1	О создании дочернего торгового унитарного предприятия Общества на территории Российской Федерации
2	Об участии в обществе с ограниченной ответственностью на территории Республики Казахстан
3	О создании филиала Общества в г. Минске Республика Беларусь
4	О внесении изменений и дополнений в устав Общества

С материалами внеочередного собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник – пятница), начиная с 2 декабря 2019 г., по месту нахождения Общества в кабинете начальника отдела правовой и кадровой работы с 08.00 до 16.00.

Наблюдательный совет ОАО «БелВитунифарм». Тел. 8 0212 209390.

УНП 811001710

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне вядучаму рэдактару рэдакцыйнага ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Ксюк Валянціне Леанідаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Дажынкі-2019

УШАНАВАЛІ ЛІДАРАЎ

Працаўнікі АПК Гродзеншчыны адзначылі абласныя «Дажынкі» ў Смаргоні

Кожны раён прыехаў у сталіцу абласных «Дажынак» з сімвалічным снапом, з іх быў складзены адзін трохметровы сноп, які ўзвышаўся на цэнтральнай плошчы. Падчас урачыстай цырымоніі старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ перавязаў сімвал ураджаю вышытым мясцовай майстрыхай ручніком. А вось агульны «сноп» склаў амаль 1,5 мільёна тон збожжа. Менавіта такі ўраджай атрыманы сёлета ў рэгіёне.

Самая важная частка свята — гэта, вядома, цырымонія ўшанавання найлепшых працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Яны сапраўды заслугоўваюць удзячнасці, бо бязмежна любяць родную зямлю і працуюць на агульны вынік. Менавіта такія словы былі адрасаваны работнікам АПК у віншавальным лісце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Аграрыяў нездарма называюць соллю зямлі. Вы абралі сваёй прафесіяй цяжкую, але пачэсную сялянскую працу. Вынікамі гэтай працы багацее наша Беларусь», — адзначаецца ў віншаванні.

Кіраўнік краіны выказаў упэўненасць, што аграпрамысловы комплекс Гродзеншчыны здольны і надалей паспяхова вырашаць важныя задачы, якія стаяць перад вобласцю, перадаваць традыцыі новым пакаленням працаўнікоў вёскі і нястомна працаваць на карысць Беларусі і яе народа.

Нягледзячы на выпрабаванні надвор'ем, вынікі сельскагаспадарчага года можна лічыць удалымі. Прыклад паказалі прызнаныя «кіты» рэгіёна. Больш за 70 цэнтнераў з гектара збожжавых і зернебабовых сабралі аграрыі вытворчага кааператыва імя В. І. Крамко Гродзенскага і СВУ «Пратасаўшчына» Шчучынскага раёнаў. Добра спрацавалі ў вобласці і па іншых культурах. Напрыклад, у рэгіёне сабрана 35 % ад усяго аб'ёму цукровых буракоў, якія вырошчваюцца ў краіне.

Самым тытулаваным можна назваць Гродзенскі раён, які стаў лідарам у абласным спаборніцтве па ўборцы збожжавых і зернебабовых, па нарыхтоўцы кармоў і ў жывёлагадоўлі. Другое месца сярод хлебаробаў заняў Карэліцкі раён, трэцяе — Бераставіцкі.

— Наша краіна падтрымлівае курс на развіццё аграрнай галіны, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Анатоль ХАЦЬКО.** — Сёння нават цяжка ўявіць, што ў 90-я гады быў дэфіцыт прадуктаў харчавання. А цяпер на экспарт пастаўляецца сельгаспрадукцыі больш чым на пяць мільярдаў рублёў, пры гэтым пастаўкі ідуць амаль у сто краін свету. Наша прадукцыя запатрабавана на замежных рынках, яна высокай якасці, адпавядае сусветным стандартам.

Анатоль Хацько ўручыў Ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, ганаровыя граматы Савета Міністраў, Міністэрства сельскай гаспадаркі кіраўнікам сельгаспрадпрыемстваў, спецыялістам, найлепшым работнікам галіны. Заслужаныя ўзнагароды атрымалі амаль 200 працаўнікоў аграпрамысловага комплексу вобласці.

Дарэчы, падчас фестывалю былі працягнуты традыцыі, якія склаліся на абласных «Дажынках» у папярэднія гады. Гэта і конкурс караваяў, і свята на падворках, і дэгустацыя нацыянальных страў, і конкурс на самую вялікую гародніну, і кірмаш майстроў... Але з'явіліся і новыя «фішкі». Упершыню ў Смаргоні размясціўся кантактны заапарк сельскагаспадарчых жывёл, а таксама этнаграфічны музей пад адкрытым небам. Выступілі з паказальнай праграмай кінолагі са сваімі гадаванцамі.

Безумоўна, свята запомніцца многім, хто там пабываў. Але застанецца і тое, што будзе нагадваць пра фестываль у Смаргоні кожнаму, хто пройдзе па пешым бульвары горада. Да свята «Дажынкі-2019» тут усталявалі каля 20 драўляных лавак з каваным ажурным аздабленнем. Кожная з іх адзначана гербам аднаго з раёнаў Гродзеншчыны. Гэта падарунак сталіцы фестывалю ад вобласці.

Плануецца, што наступныя абласныя «Дажынкі» будзе прымаць горад-спадарожнік Гродна — Скідзель.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Калейдаскоп

Не расстануся са смартфонам!

Мабільны аператар МТС прааналізаваў актыўнасць абанентаў, палічыўшы колькасць званкоў, СМС і інтэрнэт-трафіку на працягу сутак. Высветлілася, што раней за ўсіх пачынаюць дзень у Дубровенскім раёне, а пазней за ўсіх кладуцца спаць у Полацкім. У топ-5 раёнаў з абанентамі-жаўрукамі патрапілі таксама Лёзненскі, Расонскі, Гарадоцкі і Бераставіцкі.

Па статыстыцы, пік актыўнасці выкарыстання інтэрнэту ў Беларусі прыпадае на перыяд з 11 да 12 гадзін. Усплёск тэлефонных размоў і адпраўкі СМС адбываецца з 17 да 18 гадзін. «Ціхая гадзіна» ў Беларусі, калі большасць абанентаў адпачываюць ад гаджэтаў, доўжыцца з 4 да 5 раніцы. Горадам, які не спіць, стаў Мінск: са смартфонамі тут не расстаюцца практычна круглыя суткі. У топ-5 уваходзяць таксама Брэст, Гродна і Віцебск. Замыкае пяцёрку Магілёў. У гэтых гарадах мабільны трафік актыўна генеруюць нават глыбокай ноччу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МАЛАПАВЯРХОВЫЯ ДАМЫ АБСТАЛЮЮЦЬ ЛІФТАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дырэктар РУП «Будтэхнорм» Ігар ЛІШАЙ дадаў, што да змен павінны быць гатовыя і інфраструктура, і грамадзяне. Прылада пад'ёмнага механізма і яго эксплуатацыя патрабуюць дадатковых фінансавых выдаткаў і рашэнняў. «Перад тым як уносіць гэтую норму, праводзілі шэраг нарад, збіралі прадстаўнікоў Дзяржпрамнагляду, Мінжылкамгаса, спецыялізаваных абслуговых арганізацый. І гэтае пытанне будзе вырашацца комплексна», — сказаў ён. У якасці прыкладу Ігар Лішай прывёў невялікія населеныя пункты, дзе неабходна забяспечыць абслугоўванне ліфтавай гаспадаркі. «Службы нібыта гатовыя, але паглядзім, што з гэтага атрымаецца ў рэальнасці».

— Напрыклад, будуецца дом у раённым цэнтры. Абсталёўваецца ліфтам. І адразу паўстае пытанне: а куды будзе выводзіцца сігнал? Зразумела, што ў Мінску створаны дыспетчарскія службы. І калі чалавек затрымаўся, націснуў кнопку — там адкажуць і прыедуць на дапамогу. А ў невялікім населеным пункце, дзе ліфтаў ніколі не было, неабходна падумаць, куды выводзіць сігнал, хто і як хутка зможа аказаць дапамогу. Бо норму заўсёды проста ўнесці. Як яе рэалізаваць — вось у чым пытанне.

Акрамя таго, магчыма, гэтай нормай будуць незадаволеныя некаторыя іншыя катэгорыі грамадзян, якія кожную капейку лічаць. Бо, напрыклад, для трохпавярховага жылога дома з ліфтам кошт квадратнага метра жылля будзе значна вышэйшы, чым калі б пад'ёмнай прылады не было.

Новая норма будзе абавязковая. Акрамя новабудоўляў, яна закране і дамы, якія рэканструююцца. Чакаецца, што новаўвядзенне ўвойдзе ў сілу з сакавіка наступнага года.

50 «квадратаў» — максімальная кватэра-студыя

А яшчэ ў нашай краіне хутка ўстановяць больш жорсткія патрабаванні да кватэр са свабоднай планіроўкай. Гэтая норма накіравана на павышэнне бяспекі будынкаў.

Па словах Ігара Лішая, гэтае пытанне не ўрэгулявана. Бывае, уласнікі кватэр пры рамонце памяшканняў усталёўваюць перагародкі без уліку іх уплыву на канструкцыю дома. Не ўлічваюцца крытэрыі падмурка і пліт перакрыццяў. Цяпер жа вяртаюцца мінімальныя патрабаванні на гэты конт.

У прыклад спецыяліст прывёў замежны вопыт, калі ў праект уносяцца ўсе неабходныя рашэнні, а пры куплі будучыя новыя жыльцы адмаўляюцца ад асобных элементаў. Пры гэтым апорная здольнасць разлічваецца пры поўным камплекце перагародак. Праекціроўшчык разумее, як пераразмяркоўваецца нагрузка і ці можна прыняць адмову ад некаторых элементаў, бо гэта небяспечна.

У прыватнасці, будзе абмежаваная плошча кватэр-студый, якія не змогуць быць большыя за 50 квадратных метраў. Вызначаны мінімум абавязковых работ: наяўнасць стаяка каналізацыі, абсталяванне сантэхнікай ваннай і туалета, разводка праводкі (без падключэння канкрэтных прыбораў). Па словах спецыяліста, цяпер на рынку прадстаўлены ў тым ліку кватэры са свабоднай планіроўкай плошчай 100—180 «квадратаў», дзе падведзена толькі электрычнасць да ўваходных дзвярэй. Пасля здачы дома ў эксплуатацыю жыхары перабудоўваюць прастору, у тым ліку без дапамогі спецыялістаў. Навасёлы дзяўбуць сцены, завозяць тоны пяску і іншых будаўнічых матэрыялаў, такім чынам ствараючы нагрузку на пліты перакрыццяў. «Усё ж такі мы ў гэтай дэмакратыі зайшлі занадта далёка», — лічыць эксперт.

Акрамя таго, пры свабоднай планіроўцы ванна можа знаходзіцца над спальняй суседа, якую пры прарыве стаяка залье. Змяненне будаўнічых нормаў дасць магчымасць пазбегнуць такіх сітуацый. Як часовае рашэнне праблемы рыхтуецца інфармацыйны ліст на заказчыкаў і праектныя арганізацыі, дзе гаворыцца аб вяртанні мінімальных патрабаванняў. Суразмоўца не лічыць, што норма негатыўна адаб'ецца на рынку такога жылля. Гэта аснова для пераходу на адмаўляльныя работы, якія раней, па сутнасці, і былі.

33 нормы, а ўсяго — каля 70

Вольга Верамей адзначыла, што да канца года ў міністэрстве будзе дадаткова зацверджана яшчэ 26 будаўнічых нормаў. Як вядома, першыя сем набылі сілу ў лістападзе. Астатнія будуць дапрацаваныя да пачатку новага года.

— Цяпер яны накіраваны на прававую экспертызу. Гэтыя нормы датычацца бяспечнай эксплуатацыі будынкаў, у тым ліку інжынерных камунікацый, распрацоўкі праектаў па ключавых інжынерных збудаваннях — мастах і трубах. Яны будуць уведзеныя ў дзеянне з 1 лютага 2020 года, — адзначыла начальнік упраўлення.

Усяго ў будаўніцтве будзе ўжывацца максімум 65—70 спецыяльных нормаў. Іх плануюць зацвердзіць налета. Як растлумачыў Ігар Лішай, на сённяшні дзень ужо вядома пра 62 будаўнічыя нормы, якія падрыхтоўваліся Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. На яго погляд, згодна з 217-м Указам Прэзідэнта спецыялісты міністэрства павінны перагледзець прапановы ўсіх дзяржорганаў па змяненні іх ведамасных дакументаў, якія павінны ўключыць у будаўнічыя нормы. Таму што і ў МНС, і ў Мінэнерга, і ў Міністэрства аховы здароўя былі свае дакументы, якія пашыраліся раней на праектаванне будынкаў і збудаванняў. Канчатковая задача экспертаў цяпер — сабраць гэтыя патрабаванні і зразумець, што трэба ўключыць у абавязковыя нормы. Таму колькасць дакументаў яшчэ канчаткова не вызначана.

Што не забаронена, тое можна

Увядзенне будаўнічых нормаў істотна спросціць увядзенне новых будаўнічых матэрыялаў і сучасных тэхналогій. Гэта адбудзецца таму, што ў сферы будаўніцтва жылля не будзе канкрэтных аб'ёмна-планіровачных канструктыўных рашэнняў, абавязковых прадпісанняў, якія выклікаюць нараканні як арганізацый, так і грамадзян.

Цяпер будуць толькі параметры бяспекі. Калі тэхналогія, будматэрыял іх забяспечваюць, значыць, яны могуць ужывацца. Напрыклад, на рынку з'явілася цэгла, якая ў разы перавышае памерам стандартны прадукт і ўкладваецца як канструктар.

Нормы актуальныя і для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Мэта новаўвядзенняў — зрабіць тэхнічныя рашэнні такімі, каб у грамадзяніна і праектнай арганізацыі была магчымасць пабудаваць кватэру і дом сваёй мары. Вольга Верамей нагадала, што ў краіне створаны фонд праектнай дакументацыі, у тым ліку малапавярховай забудовы. Даслаўшы запыт, можна за плату атрымаць гатовы праект, які прайшоў экспертызу.

— Наша краіна знаходзіцца на важным пераломным этапе ў дачыненні да тэхнічнага нарміравання ў сферы будаўніцтва, — адзначыў Ігар Лішай. — Указ № 217 дакладна вызначыў, хто мае права ўстанаўліваць патрабаванні да праектавання, будаўніцтва будынкаў і збудаванняў, — раней гэта заканадаўча не было ўрэгулявана: кожны орган дзяржкіравання ў рамках сваёй кампетэнцыі мог прымаць тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты, якія насілі абавязковы характар. Узнікалі прававыя калізіі, калі ў дачыненні да аднаго аб'екта, тэхнічнага рашэння дзейнічала некалькі дакументаў.

Паралельна з распрацоўкай будаўнічых нормаў рыхтуюцца будаўнічыя правілы. «Мы нацэленыя на тое, каб спачатку зрабіць будаўнічыя нормы. Але ў тых выпадках, калі яны не могуць існаваць без будаўнічых правілаў, апошнія будуць прымацца адначасова. Цалкам перарпрацаваць дакументы плануем у 2021—2022 гадах. Да гэтага моманту дзейнічаюць тэхнічныя кодэксы ўстаноўленай практыкі (ТКП) — іх больш за 300. Мяркуецца іх паэтапная адмена», — патлумачыў Ігар Лішай.

Сяргей КУРКАЧ.

❍ Дарэчы

У Беларусі Указам ад 5 чэрвеня 2019 года № 217 уведзены новыя віды тэхнічных нарматыўных прававых актаў — будаўнічыя нормы і правілы. Будаўнічыя нормы Беларусі (БНБ) — гэта патрабаванні ў галіне бяспекі будынкаў і збудаванняў, прызначаныя для абавязковага прымянення. Будаўнічыя правілы Беларусі (БПБ) — спосабы дасягнення будаўнічых нормаў. Прымяняцца БПБ будуць на добраахвотнай аснове.

Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты іншых дзяржаўных органаў у частцы, што ўстанаўлівае абавязковыя патрабаванні пры праектаванні і будаўніцтве аб'ектаў, падлягаюць прызнанню страціўшымі сілу пасля ўвядзення ў дзеянне БНБ і БПБ. Для праектнай дакументацыі, якая знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі, і аб'ектаў, будаўніцтва якіх распачата да ўвядзення ў дзеянне нормаў і правілаў, прадугледжаны пераходны перыяд.

ГУСЬ У МЕТАЛЕ

НЕ ПРОСТА СВЯТА — СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

Цяпер кожны, хто завітае ў Белую Дуброву, будзе ведаць: гусь для гэтай мясцовасці — не проста птушка, гэта яшчэ знак багацця і дабрабыту. Якім той сімвал павінен быць, вырашалі не толькі аграгарадком, але і ўсім раёнам. Канчатковы эскіз зрабіла мясцовая мастачка Таццяна Хобатава, а ўвасобіў яго ў метале майстар Сяргей Курбанаў — расіянін з паходжання, але вялікі прыхільнік беларускай культуры. Атрымаўся гэтакі разухабісты гусак з гармонікам і кепкай. Адкрыццё прымеркавалі менавіта да Гусінага свята. У народным календары яно пазначана ў студзені, але ў Белай Дуброве лічаць, што ўсё ж такі лепш рабіць гэта на пачатку зімы. Менавіта цяпер ідзе актыўная нарыхтоўка гусінага мяса на зімовы перыяд, а потым птушку лепш не чапаць — яна нагульвае тлушч, рыхтуецца да абзавядзення нашчадкамі.

— Нарэшце мы вырашыліся з датай: будзем адзначаць Гусінае свята ў апошнюю суботу лістапада, — агучыў дату падчас адкрыцця **старшыня Беладубраўскага сельсавета Мікалай КАЖАМЯКІН.** Ён асабіста прыклаў шмат намаганняў, каб у аграгарадка быў свой сімвал.

На адкрыццё арт-аб'екта прыехалі мясцовае кіраўніцтва, старшыні ўсіх сельсаветаў (іх у раёне сем). Мясцовую славутасць стваралі, як той казаў, усім светам. Вялікую дапамогу аказалі старшыня райвыканкама Дзмітрый Малашэнка, вядучыя прадпрыемствы раёна. Лясгас, напрыклад, зрабіў новую альтанку, і, як паабяцаў старшыня сельсавета, да лета прадпрыемства дапаможа яшчэ больш акультурыць месца адпачынку ў Белай Дуброве. У стварэнні аб'екта бралі ўдзел райаддзел па НС, камунальнікі, мясцовыя жыхары... Дарэчы, пастамент для гусака — камень вагой дзевяць тон — быў знойдзены ў кар'еры Высокае цэмзавода, што ў Касцюковічах. Падымала яго некалькі брыгад з дапамогай 10-тоннага крана. Ужо на месцы ратавальнікі дапамаглі «пасадзіць» камень, а будаўнікі паклалі вакол яго плітку.

Дарэчы, разам з Гусіным святам аграгарадок адзначыў і свой юбілей — 325 гадоў.

— Тут заўсёды жыло працавітае насельніцтва, якое трымала парасят, гусей, іншую жыўнасць, — кажа **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Касцюковіцкага райвыканкама Святлана ЛІСТРАЦЕНКА,** якая шэсць гадоў працавала ў Белай Дуброве дырэктарам школы. — Гусей было шмат, таму што рака Бесядзь побач. На жаль, маладыя не вельмі любяць займацца гаспадаркай, магчыма, свята натхніць яшчэ кагосьці завесці гэтую птушку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АДРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Жартаўлівую гісторыю пра гаспадынь, якія адна перад адной выхваляюцца, у каго гусі лепшыя, стварылі па народных матывах артысты мясцовага цэнтра культуры.

Таццяна ЯРАШ запрашае пачаставацца.

— Нічога не прыдумана, усё так і было, — сведчыць **намеснік кіраўніка цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна Святлана ЗАХАРЭНКА.** — Гэта наша брэндавае мерапрыемства, па якім пазнаюць раён. Ездзілі з фальклорнымі экспедыцыямі да старажылаў, збіралі песні, абнавілі рэпертуар Гусінага свята, зрабілі яго больш шырокім і маштабным. У праграме задзейнічалі іншыя калектывы, у якіх быў фальклорны матэрыял па святе. Цяпер мы яго возім па ўсіх форумах і рэкламуем. А каб было цікава і моладзі, старадаўнія традыцыі вырашылі асучасніць у адпаведнасці з праектам «Ад вытокаў да сучаснасці». Робім свята на новы лад, але з традыцыйнымі элементамі — гусінымі бягамі, кірмашом, прыпеўкамі. У гульнявой форме паказваем, як з печкай абыходзіцца, як віламі карыстацца і гэтак далей. На той жа штанзе ў нас замест металічных дыскаў — важкія гарбузы.

— Гусіная тэма нас усіх аб'яднала, — усміхаецца Мікалай Кажамякін. — Майстры вельмі падтрымалі. Зрабілі сувеніры з сімволікай, гаспадыні могуць набыць сабе на памяць апрацоўчую дошку з лагатыпам — танцуючая гусь. А мясцовых жыхароў, магчыма, такі падыход натхніць на жаданне завесці больш гусей, каб наша Бесядзь, як у былыя часы, была ад іх уся белая, каб мы елі карысныя прадукты, каб наш дабрабыт рос і мы квітнелі.

НА СТАЛЕ БАГАТА — УДАЛОСЯ СВЯТА

Якіх толькі прысмакаў не было на гасцінных сталах!

— Рулет мясны з яйкамі і блінамі, — дэманстравала свае ядомыя творы мастацтва **пенсіянерка з Белай Дубровы Таццяна ЯРАШ.** — А гэта наша асноўная дамашняя ежа — сала з яйкамі і цыбуляй, — тое, што грэе ў зімовыя халады.

На стале Таццяны Яраш чаго толькі не было: пірог з вішнямі, блінцы з тварагом, аджыка з кетчупам — рэцэпт такі смачны, што даўно стаў адным з папулярных у Белай Дуброве і нават за яе межамі. Дарэчы, жанчына трыццаць гадоў працавала... электразваршчыкам. Родам яна з Данецкай вобласці, там жа набыла экзатычную для слабага полу спецыяльнасць. Паспела папрацаваць у якасці зваршчыка на касцюковіцкім цэмзаводзе і ў камуналцы. У Беларусі жыве ўжо 22 гады, сюды яе прывёз муж-беларус. Тут нарадзіліся іх дзеці і таксама знайшлі сабе спадарожнікаў жыцця. Шчаслівая бабуля мае чатырох унукаў.

— Жывём у вёсцы і радуемся, іншага жыцця не жадаем, — кажа яна.

Смачную грэчку з тушонкай прыгатаваў ваенны камісарыят Касцюковіцкага раёна, а шурпу з бараніны — калгас «Белая Дуброва». Гаспадарка купіла барана, а гатаваў смакату яе работнік — Віталій Лызікаў. Гаспадар, дарэчы, жыве ў Белай Дуброве і таксама трымае гусей. Да свята наварыў 80 літраў шурпы!

Гасцей у Белую Дуброву прыехала, як пяецца ў вядомай песні, «з розных валасцей». Алена, напрыклад, турыст-аматар з Мінска. Прызналася, што працуе бухгалтарам і, каб не скіснуць зусім ад гэтых лічбаў, актыўна падарожнічае па народных святах. Адрасы знаходзіць на сайтах цэнтраў народнай творчасці. У Касцюковіцкі раён прыехала сваім ходам, прычым упершыню. І была ў захапленні. Цікавілася, як даехаць да Саматэвіч, каб на свае вочы ўбачыць славутую Свята-Троіцкую царкву, пра якую пішуць у інтэрнэце.

Ну якая ж смачная шурпа.

Таццяна Крымкова — жыхарка аграгарадка, прыйшла разам з мужам Русланам, сынам Данілам і дачкой Вікторыяй. У сям'і, дарэчы, чацвёра дзяцей. Зразумела, без гаспадаркі такому вялікаму сямейству на вёсцы не абысціся. На падворку ёсць свінні, куры. Цяпер Таццяна задумалася, каб завесці яшчэ і гусей. Свята вельмі натхніла.

А вось Соф'і Яфрэменцы, якой ужо за 80, хапае яшчэ сіл не толькі гусей глядзець, але і цялушку. Вясной карміцелькі не стала, дык жанчына папрасіла старшыню мясцовай гаспадаркі, каб дапамог прыдбаць цельную кароўку.

— Дзетачкі, трымайце гусей, трымайце жывёлу, а то развялося шмат сабак, а кароў няма, — перажывае пенсіянерка. — Вось я хачу, каб кароўка была на двары. Цяжка, але ж хачу, каб была менавіта свая. І гусей таксама павінна быць шмат. Выйду, пагляджу на нашу Бесядзь — так прыгожа, лес вакол. А раней, кажуць, тут толькі дуб рос ды бяроза. Таму і вёску сталі называць Белая Дуброва. Тут заўсёды жылі працавітыя людзі. Без працы якое жыццё? Калі нешта робіш, ніколі хварэць не будзеш. Варушуся — і ўсё нармальна, а лягу — галава, як у п'янай.

Староста Белай Дубровы Людміла Стральцова таксама трымае гусей і іншым раіць. «Па-першае, мяса смачнае, па-другое, чысты прадукт, без дабавак: асноўная ежа гусей — трава ды вада. Я гатова кожнаму ахвотнаму падказаць, як разводзіць птушку. Не трэба будзе купляць у чужых, будзем гадаваць сваіх — беладубраўскіх.

Дэгустацыі, гульні, конкурс прыпевак, узнагароджанне работнікаў АПК — свята сапраўды атрымалася вясёлае і грунтоўнае. Прыпевачніцы, калектывы мастацкай самадзейнасці ад сельсаветаў, механізатары, трактарысты — найлепшыя з лепшых атрымалі дыпломы і сувеніры.

— Па сутнасці, мы сёння падводзім вынікі сельскагаспадарчага года. Ён быў напружаны і складаны, але ўсе добра папрацавалі і маюць права добра адпачыць, — заўважыў старшыня Беладубраўскага сельсавета Мікалай Кажамякін.

— Для жыхароў аграгарадка гэта доўгачаканае свята, яго аднавілі дзякуючы ініцыятыве сельсавета, работнікаў культуры і ідэалогіі. Мерапрыемства атрымала раённы ўзровень, і гэта дае магчымасць адзначаць яго з раённым размахам. А для жыхароў аграгарадка ёсць магчымасць сабрацца разам і ў добрым настроі пабавіць час. Гэта аб'ядноўвае і выхоўвае любоў да малой радзімы, да сваёй зямлі, — адзначыла **намеснік старшыні Касцюковіцкага райвыканкама Ірына ПЕТРУСЕВІЧ.**

Галоўны сімвал свята.

— Плануем, каб кожны населены пункт меў свой сімвал, сваё свята, — канстатавала Святлана Лістраценка. — Вось у Забычанні нядаўна адбылося Свята бульбы. Гэта ж наш другі хлеб, чаму б не прынесці яму даніну павагі? Гаспадыні нарыхтавалі на шэсць сталоў смакаты з бульбы. Спачатку была выстаўка, а потым дэгустацыя. Жыхары прадавалі бульбу, цыбулю, яблыкі. Заўсёды ў такіх мерапрыемствах задзейнічаныя райспажыўкааперацыя і самадзейнасць. Народ любіць і падсілкавацца, і патанчыць. У аграгарадку Тупічына яшчэ раней прайшло Свята цыбулі. А перад ім адбыўся Ільінскі кірмаш у Новых Саматэвічах. Ён праводзіўся з даўніх часоў, яшчэ ў старых Саматэвічах, але сёння гэта выселеная вёска. Мы ж адрадзілі традыцыю, і жыхары за гэта сказалі дзякуй.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Извещение о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества ООО «Вернисаж».

Организатор торгов – ликвидатор ООО «Вернисаж» – ООО «Парусник»: 210029, г. Витебск, ул. Правды, 48, каб. 11; тел.: 80212687596, 375445858852, 375295160300.

Продавец – ООО «Вернисаж», тел.: 8 0212687596, 375445858852, 375295160300.

Первые повторные открытые электронные торги состоятся **30.12.2019 на электронной торговой площадке www.torgi.gov.by** во время и согласно правилам торговой площадки, размещенным по адресу: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule.**

№ лота	Наименование	Начальная цена, руб. (без НДС)
1	Станок токарно-винторезный	2801,66
2	Станок прирубочный	1364,77
3	Станок вертикально-сверлильный	1098,49
4	Станок деревообрабатывающий от БДС	827,69
5	Котел водонагревательный	62,74
6	Станок рейсмусовый	2183,84
7	Прибор чертежный	362,90
8	Котел ЭПЗ-10042	161,53
9	Станок шлифовальный ШЛПС Houfek	2520,00
10	Компрессор передвижной	473,36
11	Пресс механический	7541,74
12	Станок вертикально-фрезерный	5341,77
13	Пила отрезная Boch	548,42
14	Тележка гидравлическая ТГВ 1250	89,86
15	Пила с отсас. устройством	4747,10
16	Компьютер	408,60
17	Прибор лазерный	601,83
18	Вентилятор пылевой ВЦП 5-45	171,53
19	Шлифовальная машинка	755,26
20	Вибрационная машинка	699,26
21	Дрель угловая	445,27
22	Фрезерная машинка	786,72
23	Термовоздуходув	802,20
24	Машинка ленточношлифовальная	752,08
25	Флокатор ЭЛФ 130 м	926,71

Местонахождения предмета торгов: г. Минск, ул. Айвазовского, 50. Ознакомиться с предметом торгов, а также узнать подробную информацию можно в пн. – пт. с 9.30 до 17.00 по тел. +37529 646 11 54. Срок для ознакомления – по 29.12.2019.

Торги проводятся в день, время и месте, указанные в извещении. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота. Победителем торгов признается лицо, предложившее наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что на участие в торгах подано заявление только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с аукциона предмет торгов или отказаться от проведения торгов

Участник, выигравший торги, обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, но не позднее 20 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи предмета торгов

Задаток устанавливается в размере 10 % от начальной цены лота. Порядок и банковский реквизиты для зачисления задатка устанавливаются торговой площадкой **www.torgi.gov.by**

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, устанавливается торговой площадкой **www.torgi.gov.by**

Заявления на участие в торгах и прилагаемые к ним документы принимаются в сроки и порядке, установленные торговой площадкой **www.torgi.gov.by**

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится участником, выигравшим торги, по фактическим затратам. Участник, выигравший торги, обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат, в т. ч. затрат по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся торгам, в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов

Правила допуска к участию в торгах определяются торговой площадкой **www.torgi.gov.by.**

Извещение о результатах торгов составляется торговой площадкой **www.torgi.gov.by.**

После предъявления участником, выигравшим торги, копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение торгов, между Продавцом и участником, выигравшим торги, заключается договор купли-продажи предмета торгов. Договор купли-продажи предмета торгов должен быть заключен не позднее 10 календарных дней с момента определения победителя торгов

Ранее опубликованные объявления о проведении торгов: газета «Звязда», № 184 (29051) от 27.09.2019

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Чайка» (г. Гродно, пер. Виленский, д. 16) 24 декабря 2019 года

Вид аукциона: открытый	Лот № 1
Предмет аукциона	Комплекс зданий, сооружений и оборудования, включающий 8 капитальных строений (здание административное, здание склада, здание гаража – 2 шт., здание проходной – 2 шт., здание склада готовой продукции), 4 передаточных устройства (участок тепловой сети, участок водопроводной сети, участок канализационной сети, элементы благоустройства), зеленые насаждения, 2 единицы оборудования
Начальная цена продажи	**1 826 681,16 рубля** (с учетом НДС 20 %)
Кадастровые номера земельных участков и размеры	440100000002001136 площадью 0,7335 га
Месторасположение земельного участка	**Гродненская область, г. Гродно, пер. Виленский, д. 16**
Продавец	**Открытое акционерное общество по химической чистке одежды и стирке белья «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел.: 8 (0152) 607302, 745502**
Имущественное право земельных участков	Право постоянного пользования
Сумма задатка	**54 800,43 рубля**
Организатор аукциона	КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010
Дата проведения аукциона	**24 декабря 2019 года**
Время проведения аукциона	12.00
Место проведения аукциона	**г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407
Дата и время начала приема документов	28 ноября 2019 года 8.00
Дата и время окончания приема документов	18 декабря 2019 года 16.00

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «КОБРИНСКИЙ ССК»

Предметы аукциона

Лот № 1: грузовой автомобиль КАМАЗ 65116, тип – грузовой седельный тягач, год выпуска 2008 г., регистрационный знак АВ 2114-1

Начальная цена продажи, руб. (без НДС)	**5 100,00**	**Размер задатка, руб.**	**510,00**

Лот № 2: 1) кран мостовой, год выпуска 1987 г., инвентарный номер 237; 2) кран мостовой, год выпуска 1987 г., инвентарный номер 238

Начальная цена продажи, руб. (без НДС)	**3 200,00**	**Размер задатка, руб.**	**320,00**

Продавец: ОАО «Кобринский ССК», Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 58, УНП 200040677.
Организатор торгов: РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал.
Р/с для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Условия продажи: без условий. Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона

Аукцион состоится 27 декабря 2019 г. в 11.00 по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Перечень документов для участия в аукционе и иную информацию можно узнать по телефонам 8 (0162) 20-92-13; 21-88-81

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00 Последний день приема заявлений – 26 декабря 2019 г. до 17.00

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Доломит»

Лот № 1: здание нежилое, инв. № 200/С-103170, площадь – 244,2 кв. м, г. п. – 1972. **Адрес:** г. Витебск, ул. Парковая, 1А. **Начальная цена, бел. руб.** – 16 200,00 с НДС. **Задаток, бел. руб.** – 2 000,00. Шаг аукциона – 5 %. Земельный участок площадью 0,0441 га с кадастровым номером 240155400001000234. Целевое назначение: земельный участок для обслуживания здания неустановленного назначения. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Условия аукциона: 1. Подписать договор купли-продажи Объекта в течение 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. 2. Оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. 3. Произвести государственную регистрацию перехода права собственности на Объект, а также оформить правоустанавливающие документы на пользование земельным участком в течение 30 календарных дней после подписания акта приема-передачи на Объект

Размер штрафа в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона составляет 2 000,00 белорусского рубля

Аукцион состоится 08.01.2020 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Доломит», 211321, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, г. Минск. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 08.01.2020 (Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 04.01.2020 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Лифанов Павел Игоревич, тел.: 8 (0212) 69-33-66, 8 (033) 696-53-42.

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

Извещение об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Радиоволна» (г. Гродно, м. Горького, д. 89) 24 декабря 2019 года

Вид аукциона открытый	Лот № 1
Предмет аукциона	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-24602 (административное здание) общей площадью 4119,0 кв. м, капитальное строение с инвентарным номером 400/С-138758 (благоустройство) общей площадью 839,0 кв. м, в том числе: асфальтобетонное покрытие автодорог и автостоянки, тротуары, наружное ограждение территории железобетонное, ворота металлические, зеленые насаждения
Начальная цена продажи	**2 968 136,57 рубля** (с учетом НДС 20 %)
Кадастровые номера земельных участков и размеры	440100000002009886 площадью 0,3578 га
Месторасположение земельного участка	Гродненская область, г. Гродно, ул. Максима Горького, д. 89
Продавец	Открытое акционерное общество «Радиоволна», г. Гродно, ул. Максима Горького, д. 89, тел.: 8(0152) 433221, 414113
Имущественное право земельного участка	Право постоянного пользования
Сумма задатка	148 406,83 рубля
Организатор аукциона	КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010
Дата проведения аукциона	24 декабря 2019 года
Время проведения аукциона	12.00
Место проведения аукциона	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407
Дата и время начала приема документов	28 ноября 2019 года 8.00
Дата и время окончания приема документов	18 декабря 2019 года 16.00

* – Условия проведения аукциона: 1. Сохранение эвакуационных выходов из примыкающего сборочного корпуса на 4-м и 2-м этажах административного здания.
2. Предоставление (в случае необходимости и чрезвычайных ситуаций) свободного доступа к корпусу 7а, ул. Горького, 89 (зал совещаний и спецподвал) со стороны зданий РУП «Белтелеком».
3. Объект ограничен (обременен) правом аренды по договору аренды сроком действия до 21.04.2022 г. (площадь 70,7 кв. м). Согласно пункту 6.3. договора аренды в случае отчуждения имущества на торгах (аукционе) и переходе права собственности на арендуемое имущество до истечения срока аренды. Арендатор обязуется расторгнуть договор аренды без дополнительных условий и освободить арендуемые помещения в течение 10 календарных дней с момента заключения договора продажи реализованного имущества на торгах (аукционе).
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении задатка за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Адреса сайтов: www.grodno.gov.by, www.gcn.by

Гайненский сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 26декабря 2019 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. рублей)
1	д. Логоза, ул. Сиреневая, У-1 кадастровый номер 623280806401000373, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1472	Подъездные пути удовлетворительные	6300,00	1260,00	2142,46 + расходы за размещение объявления
2	д. Беланы, ул. Березовая, У-4, кадастровый номер 623280800801000046, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1482	Подъездные пути удовлетворительные	6000,00	1200,00	1743,08 + расходы за размещение объявления
3	д. Селец, ул. Озерная, д. 44, кадастровый номер 623280811201000074, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1484	Подъездные пути удовлетворительные	4100,00	820,00	1574,66 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: 26 декабря 2019 в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Логоза, ул. Центральная, д. 2, Гайненский сельский исполнительный комитет, конт. тел.: (801774) 56435, 56436, 56498; (+37529) 1283467.
Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 19.12.2019 включительно.
Для участия в аукционе необходимо:
1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. представить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.
Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.
Задаток перечисляется на расчетный счет № BY60AKBB36006190211080000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X г. Минск, код 795, ОКПО 04431493, УНН 600537220, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.
Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников**.** Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.
Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку», в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 26.12.2019 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 613/С-14256, общей площадью 538,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623050100001002645 по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки, ул. Ленина, 14. Назначение строения: здание специализированное розничной торговли. Наименование строения: здание магазина. **Начальная цена продажи – 113 400,00 бел. руб., задаток – 11 340,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**
Лот № 2. Капитальное строение с инв. номером 610/С-61321 общей площадью 41,5 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000857 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 17/3. Назначение строения: здание специализированное транспорта. Реагентная. **Начальная цена – 21 708,00 бел. руб., задаток – 2 170,8 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**
Лот № 3. Капитальное строение с инв. номером 610/С-61322 общей площадью 164,8 м², расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100014000858 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 17/4. Назначение строения: здание специализированное – иного назначения. Бункерная для масла. **Начальная цена – 26 028,00 бел. руб., задаток – 2 602,8 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.
3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «недвижимость»

Аукцион состоится 26.12.2019 в 14.00 по адресу:
г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 20.12.2019 в 14.00.
Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), лот №___, проводимом 26.12.2019 года.
Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента в любое время до объявления его проданным

Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63

«Яна паставіць варыць суп, а сама можа легчы і заснуць»

Калі ў сям'і — чалавек з дэменцыяй...

У 86-гадовага Алега Паўлавіча нечакана пачаў псавацца характар. Ён стаў, па словах яго жонкі, нейкі злы, падазроны, прыдзірлівы... Хоць усё сваё жыццё яна ведала яго як ціхага, лагоднага, інтэлігентнага чалавека.
А не так даўно Алег Паўлавіч падышоў раніцай да сваёй жонкі і вінавата сказаў: «Ведаеш, я вынес і выкінуў усё, што было ў хаце: усе грошы, дакументы, альбомы...»

Зage.ru

Такія сумныя гісторыі...

— Усё гэта мы потым пайшлі шукаць на сметнік і сёе-тое нават адшукалі, — апавядае яго жонка Вольга Іванаўна (імёны герояў зменены). — Мы з ім аб'ездзілі ўвесь свет у свой час: былі ў Лондане, Парыжы, Нью-Ёрку... Было столькі альбомаў з фотаздымкамі! Усе яны зніклі, а вось грошы мы знайшлі і прынеслі назад дадому. Яны былі ў скрынцы — тысяча долараў, і гэтую скрынку камунальнікі яшчэ не паспелі вывезці разам з іншым смеццем.

А потым мой муж замоўк — спачатку маўчаў па 2-3 гадзіны, потым практычна зусім перастаў размаўляць. Далей перастаў есці... (Вольга Іванаўна сумна глядзіць кудысьці ўдалячынь і ўздыхае). Адзін раз падышоў да мяне, я гляджу, а ён зусім голы. Гэта так не падобна на яго, ён стаў зусім іншым чалавекам! Раней ён быў такі сарамлівы...

Дактары прапісвалі яму таблеткі, але ніякага эфекту ад іх я не бачыла. Скончылася ўсё тым, што я выклікала дадому прыватнага псіхолага, які сказаў, што яго трэба тэрмінова шпіталізаваць. І на наступны дзень мы паклалі яго ў Рэспубліканскі цэнтр псіхічнага здароўя, у Навінкі. Я ўвесь час плакала, у мяне самой на фоне гэтых перажыванняў пачаліся праблемы з памяццю, я ўпала ў дэпрэсію...

У чымсьці падобная гісторыя і ў Юрыя Пятровіча, чыя жонка, 80-гадовая Галіна Канстанцінаўна, стала змяняцца проста на вачах.

«Яна стала ўсё забываць», — спачатку лаканічна кажа ён. А потым пачынае расказваць у падрабязнасцях...

— Аднойчы яна забылася выключыць ваду, і мы залілі суседзяў. Яшчэ неяк мы з ёй пайшлі з дому разам і нас абодвух не было цэлы дзень. Я не праверыў за ёй, а яна пакінула адкрытай падачу газу ў газавай пліце. Вярнуліся дадому — моцны пах газу. Добра, што абышлося без выбуху. На наступны дзень я ўзяў яе за руку і пайшоў да дактароў... Увогуле пра гэта можна доўга расказваць.

Цяпер яна памятае ўсё, што было пры цару Гароху: сваю маладосць, вучобу... А што адбылося ўчора, успомніць не можа, і тут нічога зрабіць ужо, мабыць, нельга. Паставіць варыць суп, а сама можа легчы і заснуць, яе ўвесь час цягне цяпер на сон.

— Часам даводзіцца нагадваць ёй, каб яна памылася, — з горыччу працягвае мужчына. — Мне даводзіцца кантраляваць яе, каб яна апранулася ў адпаведнасці з надвор'ем, нагадваю, што трэба падфарбаваць вусны, калі выходзім на вуліцу...

Бываюць моманты, калі яна становіцца такая злосная, што проста немагчыма. Хоць яна з вельмі інтэлігентнай сям'і і добра выхаваная, заўсёды паводзіла сябе культурна, яе ўсе любілі.

Цяпер я прымушаю яе чытаць газеты, бяру з сабой на кірмаш і ў краму, ходзім па панядзелках з ёй у аддзяленне дзённага знаходжання для людзей з кагнітыўнымі парушэннямі. Тут яна мае зносіны з людзьмі. Яны спяваюць песні, рашаюць галаваломкі, разгадваюць загадкі. Ёй вельмі падабаецца...

— Прычым калі вы ўбачыце Галіну Канстанцінаўну, вы ніколі не падумаеце, што ў яе такія праблемы, — падключаецца да нашай гутаркі **галоўны спецыяліст па сацыяльнай рабоце грамадскай дабрачыннай яўрэйскай арганізацыі «Хэсэд-Рахамім» Соф'я АБРАМАВА.** — Яна выглядае як свецкая дама. Нармальна размаўляе, усміхаецца, разумее гумар...

У гэтым і складанасць дэменцыі (слоўнік вызначае дэменцыю як набытыя кагнітыўныя парушэнні, устойлівае зніжэнне пазнавальнай дзейнасці са стратай у той ці іншай ступені раней засвоеных ведаў і практычных навыкаў і цяжкасцю або немагчымасцю набыцця новых. — **Аўт.**). Першапачаткова людзі вельмі паспяхова хаваюць яе. Справа ў тым, што чалавек да нейкага моманту добра разумее сваю праблему, вельмі перажывае з гэтай нагоды і не хоча дрэнна выглядаць у вачах навакольных. Не хоча дыскрэдытаваць сябе і сваю сям'ю. Адна жанчына, якая часам забывала дарогу дадому, аднойчы сказала: «Я, калі разумею, што заблудзілася і не магу трапіць дадому, і бачу кагосьці са знаёмых, ніколі ў жыцці не падыду, каб пра мяне потым дрэнна не падумалі. Я падыходжу і звяртаюся па дапамогу толькі да чужых людзей».

У дапамозе мае патрэбу ўся сям'я

САА3 адносіць нашу краіну да старэючых нацый. Эксперты сцвярджаюць, што ўжо праз 20 гадоў кожны трэці чалавек, сустрэты намі на вуліцы, будзе пажылы. На жаль, чым старэйшы ўзрост, тым часцей сустракаецца і дэменцыя.

Дактары называюць яе хваробай, а супрацоўнікі Цэнтра дзённага знаходжання для людзей з кагнітыўнымі парушэннямі пры дабрачыннай яўрэйскай арганізацыі «Хэсэд-Рахамім» — дарэчы, яна першая ў краіне пачала працаваць з такімі людзьмі і іх сваякамі — кажуць пра дэменцыю як пра асаблівы стан чалавека. І сваіх кліентаў называюць не «хворыя на дэменцыю», а кажуць: «Людзі, якія жывуць з дэменцыяй». Гэтая ж фармулёўка выкарыстоўваецца і ў іх дакументацыі.

І хоць спецыялісты «Хэсэд-Рахамім» сцвярджаюць, што дэменцыя — гэта не прысуд, на жаль, яна часта цяжка адбіваецца на ўсёй сям'і чалавека, які жыве з ёю. Як правіла, блізкія сваякі пры гэтым адчуваюць шок і нярэдка вымушаныя кардынальна змяніць свой лад жыцця. Хтосьці з дзяцей пажылога чалавека звычайна павінен сысці з работы, каб даглядаць яго, з часам пажылому чалавеку робіцца ўсё горш, а члены яго сям'і паступова «выгараюць»...

Адна дачка жанчыны з кагнітыўнымі парушэннямі прызналася: «Я ніяк не магу змірыцца з тым, што мая мама стала іншай». Але змірыцца з гэтым неабходна. І хтосьці павінен вучыць гэтаму сваякоў. Вучыць таму, што з чалавекам, які жыве з дэменцыяй, не трэба спрачацца, яго не трэба ні ў чым пераконваць. Проста таму, што гэты чалавек хворы, у яго парушаныя прычынна-выніковыя сувязі, ён не можа па-іншаму...

Таму ў дапамозе мае патрэбу не толькі пажылы чалавек з дэменцыяй, але і члены яго сям'і.

Разумеючы гэта, у «Хэсэд-Рахамім» акрамя стварэння аддзялення дзённага знаходжання для людзей з дэменцыяй пачалі працаваць і з іх сваякамі. Менавіта на адной з такіх сустрэч я і пачула гэтыя гісторыі. Людзі дзеляцца імі адно з адным, падтрымліваюць адно аднаго, а супрацоўнікі дабрачыннай арганізацыі вучаць іх, як можна палегчыць сваё жыццё і жыццё чалавека з дэменцыяй.

— На жаль, хвароба Альцгеймера не лечыцца, — кажа **псіхолаг «Хэсэд-Рахамім» Кацярына СЯРГЕЕВА.** — Але ёсць прэпараты, якія трохі запавольваюць яе прагрэсаванне. І калі правільна арганізаваная прастора, у якой жыве такі чалавек, — гэта значыць, калі ёсць правільны догляд з боку сваякоў і патранажных работнікаў — то нават калі стан чалавека пагаршаецца, ён можа заставацца жыць у сваім доме і абслугоўваць сябе. Таму наша задача — арганізаваць правільнае асяроддзе для людзей з кагнітыўнымі парушэннямі.

Мы стварылі тую мадэль, якую цяпер выкарыстоўваем, тры гады таму, у 2016 годзе. Для нашай арганізацыі гэта быў выклік. Спачатку мы планавалі работу дома, у больш бяспечнай атмасферы. Але людзей было шмат, і тэндэнцыя такая, што будзе станавіцца яшчэ больш, — таму мы прынялі рашэнне арганізаваць Цэнтр дзённага знаходжання для людзей з кагнітыўнымі парушэннямі на тэрыторыі нашай арганізацыі.

На сённяшні дзень у нас чатыры групы для пажылых людзей з дэменцыяй, якія знаходзяцца ў розных станах і стадыях. Першая — гэта група прафілактыкі, яе можна пачаць без дадатковых фінансаў у любой установе. У другую групу ходзяць людзі пасля інсультаў, траўмаў ці інфекцый галаўнога мозга. Трэцюю і чацвёртую групы наведваюць тыя, у каго назіраюцца складанасці рознай ступені, частка такіх людзей ужо мае медыцынскі дыягназ. І 16 чалавек займаюцца ў хатніх умовах, адзін з іх — у Барысаве. Пакуль людзі ходзяць у наш Цэнтр толькі адзін дзень у тыдзень, але гэты дзень для іх — свята.

— Я свайго мужа ўжо нікуды не выпускаю, у яго стане гэта можа быць небяспечна, — кажа ўжо знаёмая нам Вольга Іванаўна. — Але сюды, у групу, мы прыходзім кожны панядзелак. І тут муж мяняецца! Дома ён маўчыць, а тут пачаў размаўляць...

У групах з пажылымі людзьмі займаюцца па методыках, здольных запаволіць прагрэсаванне захворвання. Галоўная задача тут — кагнітыўная стымуляцыя. Трэба прымусіць мозг пажылых людзей працаваць. Для гэтага эфектыўныя гульні і практыкаванні. Гэта і складванне пазлаў, і рознага роду пляценне, і аплікацыі, і разгадванне крыжаванак, і многае іншае. Усе гэтыя заняткі дапамагаюць чалавеку быць у калектыве, не страціць сацыяльных навыкаў. І, вядома, захаваць і актуалізаваць важныя ўспаміны, падтрымаць сацыяльныя кантакты.

— Дарэчы, у ТЦСАН, каб пачаць працаваць з такімі людзьмі, трэба, каб чалавеку быў пастаўлены дыягназ, — удакладняе Кацярына Сяргеева. — А нам дыягназ не патрэбны. Калі наш сацыяльны работнік заўважае, што ў яго падапечнага з'явіліся цяжкасці такога кшталту, мы праводзім з ім анкетаванне. Але нам яно трэба не для пастаноўкі дыягназу! Нам трэба ўдакладніць, якія менавіта складанасці пачаў адчуваць чалавек, каб вызначыць яго ў адпаведную групу аддзялення дзённага знаходжання і пачаць працаваць з ім.

Святлана БУСЬКО.

Партрэт чалавека з дэменцыяй

Часцей за ўсё гэта жанчына, старэйшая за 75 гадоў, мае інваліднасць (55,6 %) і пражывае сумесна з членам сям'і, які даглядае яе (52,9 %). Прычым даглядае, як правіла, дачка ва ўзросце да 53 гадоў (у 50 % выпадкаў).

❍ Каментарый спецыяліста

ВЕЛЬМІ ДАПАМАГАЕ РАННЯЕ ВЫЯЎЛЕННЕ ПРАБЛЕМЫ

Наталля МІЛЬКОТА, загадчыца аддзела развіцця інавацыйных формаў сацыяльнага абслугоўвання НДІ працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

— На жаль, у нас да гэтага часу нізкі ўзровень інфармаванасці ў дачыненні да прыкмет і асаблівасцяў дэменцыі — як у грамадстве ў цэлым, так і ў сем'ях, якія маюць у сваім складзе пажылых людзей. І спецыялісты першаснага звяна сістэмы аховы здароўя, да якіх, як правіла, у першую чаргу звяртаюцца такія сем'і, далёка не заўсёды дапамагаюць пераадолець інфармацыйны «вакуум», бо канцэнтруюцца менавіта на прапісванні лекаў і на негатыўных прагнозах. А сем'і чакаюць аповеду пра тое, што адбываецца і як з гэтым справіцца, як сябе паводзіць, як кіраваць сітуацыяй. Да таго ж спецыялісты самі не заўсёды гатовыя бачыць у асобных сімптомах праявы дэменцыі, бо гэта патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі.

Нізкая ступень інфармаванасці грамадства і спецыялістаў з'яўляецца сур'ёзнай праблемай, таму што не спрыяе выяўленню дэменцыі, асабліва на пачатковай стадыі. Тлумачачы дэменцыю натуральным старэннем ці асаблівасцямі характару, самі людзі і іх сваякі доўгі час ігнаруюць яе праявы.

Разам з тым менавіта пры лёгкай ступені дэменцыі як медыцынская дапамога, так і сацыяльнае абслугоўванне найбольш эфектыўныя. Так, своечасовы пачатак прыёму медыцынскіх прэпаратаў і выкарыстанне дадатковых, немедыкаментозных метадаў дазваляе падоўжыць перыяд лёгкай выяўленасці дэменцыі і павялічыць агульную працягласць жыцця пажылых людзей з дэменцыяй, павысіць яго якасць і дапамагае як мага даўжэй захаваць самастойнасць.

Хочацца таксама адзначыць, што магчымасць пражывання чалавека з дэменцыяй у хатняй абстаноўцы залежыць не столькі ад ступені захворвання, колькі ад створаных для яго ўмоў. Пад такімі ўмовамі трэба разумець у першую чаргу падрыхтоўку яго асяроддзя (работу са сваякамі), пастаянную трэніроўку навыкаў і памяці пажылога чалавека і іх развіццё (праз заняткі па дробнай маторыцы, творчасці), а таксама адаптацыю навакольнага асяроддзя пад патрэбы чалавека з дэменцыяй.

Таму ў найбліжэйшай перспектыве мы бачым неабходнасць стварэння ў дзяржаве спецыялізаваных аддзяленняў у дамах-інтэрнатах (прафілактычных — у дамах-інтэрнатах агульнага тыпу і геронтапсіхіятрычных — у псіханеўралагічных інтэрнатах) і развіццё паслуг для грамадзян з дэменцыяй, якія даюцца ў аддзяленнях дзённага знаходжання для пажылых у ТЦСАН. Вельмі важным з'яўляецца таксама ўключэнне элементаў ранняга выяўлення і прафілактыкі ў стандартную работу ТЦСАН з пажылымі людзьмі.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 8 (46)

Міжнароднае супрацоўніцтва

Экалогія — агульны клопат Мінска і Вены

Паміж Аўстрыяй і Беларуссю наладжана супрацоўніцтва ў розных сферах, у тым ліку па лініі Мінпрыроды

Прыкметнае месца ў праграме сустрэч і перагавораў падчас афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Аўстрыйскую Рэспубліку займала экалагічная тэматыка. У складзе беларускай дэлегацыі быў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Худык.

Аўстрыя і Беларусь маюць вопыт супрацоўніцтва ў межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Водная ініцыятыва Еўрапейскага саюза плюс для краін Усходняга партнёрства (BIEC+)». Па словах Андрэя Худыка, пры актыўнай падтрымцы спецыялістаў Федэральнага агенцтва па навакольным асяроддзі Аўстрыі праведзена ацэнка дзеючай сістэмы маніторынгу паверхневых і падземных вод Беларусі і яе прыборнай базы. Падрыхтаваны пералік неабходнага абсталявання для павышэння лабараторнага патэнцыялу пры правядзенні маніторынгу паверхневых вод. Чакаецца пастаўка абсталявання ў нашу краіну.

Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Падчас сустрэчы з кіруючым дырэктарам Федэральнага агенцтва па навакольным асяроддзі Аўстрыі Монікай Мёрт, дамаўляючыся аб супрацоўніцтве, бакі вырашылі ўдзяліць асаблівую ўвагу такім кірункам, як адаптацыя да змены клімату, «разумныя» гарады, устойлівая мабільнасць, кіраванне якасцю паветра, адходамі і рэсурсамі, шматфункцыянальнае землекарыстанне і іншыя.

Знаходзячыся ў Вене, Андрэй Худык асабліва падкрэсліў унёсак Аўстрыйскага энергетычнага агенцтва ў імплементацыю праекта «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь». У прыватнасці, у межах яго рэалізацыі летась быў арганізаваны візіт дэлегацыі беларускіх спецыялістаў, якія вывучалі вопыт развіцця аднаўляльнай энергетыкі ў Аўстрыі і абмяркоўвалі магчымасці яго ўкаранення ў нашай краіне.

Кіраўнік Мінпрыроды Андрэй Худык і дырэктар Аўстрыйскага энергетычнага агенцтва Петэр Траўпман дамовіліся аб рэалізацыі сумесных праектаў і падпісалі Мемарандум аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве паміж Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі і Аўстрыйскім энергетычным агенцтвам. Удзельнікі мемарандума дамовіліся распрацоўваць сумесныя прапановы для дзяржаўных органаў улады, а таксама для рэгіёнаў. Як у нашай краіне, так і ў Аўстрыі ўдзяляецца вялікая ўвага развіццю аднаўляльнай энергетыкі і электратранспарту. Таму бакі дамовіліся аб сумеснай распрацоўцы і ўкараненні эфектыўных тэхналагічных рашэнняў і прагрэсіўных методык у гэтых галінах.

Аўстрыйскае энергетычнае агенцтва будзе аказваць нашай краіне падтрымку ў распрацоўцы мер па правядзенні інфармацыйнай работы з насельніцтвам, навучанні і павышэнні кваліфікацыі беларускіх спецыялістаў па пытаннях змякчэння наступстваў і адаптацыі да змены клімату, развіцці «зялёнай» эканомікі, у тым ліку аднаўляльнай энергетыкі. Таксама бакі дамовіліся распрацаваць дарожную карту, якая вызначыць найбольш актуальныя кірункі сумеснай работы і забяспечыць эфектыўныя механізмы аховы навакольнага асяроддзя.

У рабочай праграме кіраўніка Мінпрыроды было наведванне завода па спальванні смецця Шпітэлау. Андрэй Худык цікавіўся не толькі тэхналагічным працэсам, але і тым, як у Аўстрыі фарміруецца заканадаўства па абыходжанні з адходамі.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Чыстая вада

У Беларусі ўсе рэкі — трансгранічныя

Як наша краіна рэалізуе асноўныя прынцыпы Воднай канвенцыі

У канцы кастрычніка ў Жэневе адбылася XIV нарада рабочай групы па інтэграваным кіраванні воднымі рэсурсамі ў межах Канвенцыі па ахове і выкарыстанні трансгранічных вадацёкаў і міжнародных азёр. У яе рабоце ўзяло ўдзел больш за 400 прадстаўнікоў з розных краін. Беларусь у Швейцарыі прадстаўлялі начальнік аддзела выкарыстання і аховы водных рэсурсаў галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна СЛІЖ *(на фота)* і намеснік дырэктара па навуковай рабоце РУП «Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў» Сняжана ДУБЯНОК.

Што такое Водная канвенцыя?

Канвенцыя па ахове і выкарыстанні трансгранічных вадацёкаў і міжнародных азёр, альбо Водная канвенцыя, была прынятая 17 сакавіка 1992 года ў Хельсінкі. Наша краіна далучылася да яе ў 2003 годзе. Цяпер бакамі канвенцыі з'яўляюцца 42 дзяржавы і Еўрасаюз, але не ўсе краіны яе ратыфікавалі.

Асноўнымі мэтамі Воднай канвенцыі з'яўляюцца ахова трансгранічных вод (у тым ліку паверхневых і падземных) шляхам прадухілення, абмежавання і скарачэння забруджвання; экалагічна абгрунтаванае і рацыянальнае кіраванне трансгранічнымі водамі; разумнае і справядлівае іх выкарыстанне; захаванне і аднаўленне экасістэм.

Нагадаем, што ў нашай краіне пяць рачных басейнаў і ўсе яны трансгранічныя з Расіяй, Украінай, Польшчай, Латвіяй і Літвой. Міжурадавыя пагадненні па ахове і выкарыстанні трансгранічных водных аб'ектаў падпісаныя з Украінай і Расіяй, у стадыі высокай гатоўнасці да падпісання такія пагадненні з Польшчай і Латвіяй. З Літвой супрацоўніцтва па водных рэсурсах ажыццяўляецца ў рамках тэхнічнага пратакола па абмене данымі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Беларусі выгадна быць бокам Воднай канвенцыі, таму што гэта дае магчымасць атрымліваць інфармацыю аб становішчы ў сумежных і іншых краінах, а таксама ўдзельнічаць у міжнародных праектах тэхнічнай дапамогі.

Водныя аб'екты: кантроль, улік і маніторынг

Адным з такіх праектаў, які рэалізуецца ў нашай краіне з 2018 года, з'яўляецца праект «Водная Ініцыятыва Еўрапейскага саюза плюс для краін Усходняга партнёрства» (BIEC+). У праекце ўдзельнічаюць шэсць краін: Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Украіна, Малдова.

Асноўная мэта праекта — удасканаленне кіравання воднымі рэсурсамі ў краінах Усходняга партнёрства, асабліва гэта датычыцца трансгранічных рэк. У яго рамках у нашай краіне міжнароднымі экспертамі дадзена ацэнка інфраструктуры маніторынгу водных рэсурсаў. Таксама праведзены тэндар на закупку сучаснага лабараторнага абсталявання для арганізацыі маніторынгу асабліва небяспечных забруджвальных рэчываў. Яны хоць і знаходзяцца ў вадзе ў вельмі малых дозах, але з'яўляюцца надзвычай таксічнымі для чалавека і водных экасістэм, таму кантраляваць іх неабходна асабліва старанна.

Праведзены комплексныя палявыя даследаванні якасці паверхневых і падземных вод у басейне Прыпяці з мэтай ацэнкі іх стану і вызначэння водных аб'ектаў, што знаходзяцца пад рызыкай забруджвання.

Пытанні трансгранічнага воднага супрацоўніцтва асабліва важныя з пазіцыі ўстойлівага выкарыстання водных рэсурсаў з улікам усё больш прыкметных кліматычных змяненняў. У гэтай сувязі за два апошнія гады Мінпрыроды праведзена вялікая работа для рэалізацыі МУР № 6 «Чыстая вада і санітарыя».

Вельмі важна, што вынікі работы можна, як кажуць, памацаць рукамі: напрыклад, сёлета завершана распрацоўка плана перспектыўнага развіцця сістэмы водазабеспячэння Капыльскага раёна Мінскай вобласці, арыентаванага на выкананне задачы 6.1 МУР № 6 «Да 2030 года забяспечыць усеагульны і раўнапраўны доступ да бяспечнай і недарагой пітной вады для ўсіх».

У 1999 годзе Водная канвенцыя была дапоўнена Пратаколам па праблемах вады і здароўя, да якога наша краіна далучылася ў 2009 годзе.

Мы запыталіся ў Таццяны Сліж, як выглядае Беларусь на міжнародным узроўні ў пытаннях кіравання воднымі рэсурсамі. Вось што яна адказала: «Складана даваць ацэнку самім сабе, але хачу адзначыць, што ў нашай краіне, пачынаючы з 2015 года, вядзецца актыўная работа па рэфармаванні воднага заканадаўства. Напрыклад, у адпаведнасці з новай рэдакцыяй Воднага кодэкса ўведзены прынцып басейнавага кіравання воднымі рэсурсамі, што прадугледжвае развіццё трансгранічнага супрацоўніцтва паміж краінамі, якія знаходзяцца ў межах аднаго рачнога басейна.

Беларусь адна з першых сярод краін СНД пачала развіваць на заканадаўчым і практычным узроўні гідрамарфалагічны маніторынг на водных аб'ектах. У межах рэалізацыі задання Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя пачата паэтапнае разгортванне сеткі пунктаў назірання за станам паверхневых вод па гідрамарфалагічных паказчыках. З мэтай укаранення еўрапейскага вопыту восенню 2019 года спецыялістамі ЦНДІКВВР ва ўзаемадзеянні з экспертамі аўстрыйскага Агенцтва па навакольным асяроддзі праведзены гідрамарфалагічныя палявыя даследаванні для 38 паверхневых водных аб'ектаў у басейне ракі Прыпяць з выкарыстаннем дыстанцыйных здымак поймаў рэк з дапамогай квадракоптара. Мы актыўна імплементуем асноўныя задачы МУР № 6 у праграмы і стратэгіі, якія закранаюць пытанні выкарыстання і аховы водных рэсурсаў».

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Зялёная» вытворчасць

«Каб задаволіць патрэбы ўсіх, нам неабходны тры планеты»

Навошта Беларусі развіваць цыркулярную эканоміку

За 70 гадоў насельніцтва Зямлі вырасла больш чым у тры разы. Сёння нас 7,7 мільярда чалавек. І гэтая лічба будзе павялічвацца. Па словах спецыялістаў, ужо зусім хутка пры нерацыянальным спажыванні некаторыя рэсурсы нашай планеты могуць скончыцца. Каб вырашыць праблему, многія краіны спрабуюць перайсці да цыркулярнай эканомікі, ці эканомікі замкнутага цыклу, і Беларусь — у іх ліку.

У нашай краіне цыркулярная эканоміка вызначана як адзін з прыярытэтных кірункаў у Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года. Асобныя яе элементы прапісаны і ў іншых праграмных дакументах. Перш за ўсё ў Дырэктыве № 3, накіраванай на эканомію, беражлівасць і рэсурсазберажэнне. Неабходнасць развіцця такой эканомікі як стратэгічнага прыярытэту дзейнасці ў сферы экалогіі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця не раз адзначалася Мінпрыроды.

— Ідэі сумеснага пошуку і ўкараненне інавацыйных спосабаў кіравання і выкарыстання наяўных рэсурсаў, у тым ліку на аснове прынцыпаў цыркулярнай эканомікі, а таксама стварэнне новых бізнес-мадэляў закладзены ў аснове зялёнай эканомікі, якая паспяхова рэалізуецца ў нашай краіне, — падкрэсліў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.**

Эканоміка замкнутага цыкла — альтэрнатыва лінейнай мадэлі рэсурсаспажывання. Пры ёй тыя рэсурсы, што бяруцца з навакольнага асяроддзя, выкарыстоўваюцца на працягу некалькіх цыклаў. Гэта дасягаецца з дапамогай уліку эка-лагічных умоў пры праектаванні (эка-дызайну), больш чыстай вытворчасці, а таксама перапрацоўкі адходаў. Такім чынам, скарачаецца нагрузка на прыроду і ўтвараецца менш смецця.

— Цыркулярная эканоміка прадугледжвае, што вытворцы павінны прадумваць усе этапы работы з рэсурсамі і імкнуцца не ператвараць іх у адходы. Напрыклад, на дрэваапрацоўчым прадпрыемстве застаецца кара. Яе можна выкінуць на звалку, а можна прадаць садаводчай гаспадарцы, дзе карой паўторна скарыстаюцца, — адзначыў **прафесар Інстытута бізнесу БДУ, кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па рэсурсаэфектыўнай і больш чыстай вытворчасці Сяргей ДАРОЖКА.** — Рэсурсаў на зямлі ўжо не стане больш, чым ёсць. А каб задаволіць эканамічныя патрэбы ўсіх дзяржаў, нам неабходны тры планеты. У нас, на жаль, столькі няма. Таму важна рацыянальна абыходзіцца з тым, што мы маем.

Эксперт таксама падкрэсліў, як адказна ставіцца Еўрасаюз да азелянення эканомікі і скарачэння колькасці адходаў. Напрыклад, у Данііўжо функцыянуе экапрамысловы парк, дзе адходы аднаго прадпрыемства служаць сыравінай для іншага. А з 2030 года ЕС плануе рэалізоўваць на ўнутраных рынках толькі тую прадукцыю, якая выраблена па прынцыпе замкнутага цыкла. Значыць, краіны, што не адпавядаюць гэтым патрабаванням, могуць страціць рынкі збыту.

У Беларусі прадпрыемствы, якія хочуць пераходзіць да цыркулярнай эканомікі, але не ведаюць, з чаго пачаць, могуць звяртацца ў Цэнтр рэсурсаэфектыўнай і больш чыстай вытворчасці. Ён створаны на базе Інстытута бізнесу БДУ. Таксама ў краіне дзейнічаюць тэматычныя рэгіянальныя клубы.

Кацярына ЦІТОВА.

Інфармацыя атрымана на семінары па павышэнні эфектыўнасці выкарыстання на прадпрыемствах Беларусі вытворчых рэсурсаў і ўкараненні на іх прынцыпаў эканомікі замкнутага цыклу, які праходзіў у Мінскім гарадскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Чытайце ў лістападаўскім нумары часопіса «Родная прырода»:

- ✓ **Навошта ў прыродзе рысь?**
- ✓ **Хто ў Беларусі арганізаваў першы Zero Waste Market.**
- ✓ **Жывёлы — не для клетак!**
- ✓ **Ідылія Ігара Сігава: адзін сабака і сем кошак.**
- ✓ **Як змены клімату ўплываюць на будаўнічую галіну.**

Другасныя рэсурсы

І батарэйкі могуць вожыкаў ратаваць

Усё залежыць ад таго, ці трапіць такое небяспечнае смецце ў спецыяльныя кантэйнеры

Памятаеце, што адна выкінутая батарэйка здольна забіць вожыка, двух кратоў і тысячу дажджавых чарвякоў? Пазбегнуць гэтага можна, калі ўтылізаваць такія небяспечныя адходы правільна. У Мінску ўжо даўно ў многіх крамах, офісах і нават у жылых дамах стаяць спецыяльныя кантэйнеры для электрычнага і электроннага абсталявання. Нядаўна падобныя з'явіліся і ў Салігорскім раёне.

Спадзяёмся, у вас дома ўжо ёсць скрынкі або пакеты, куды вы сартуеце шкло, пластык і паперу. Час да іх дадаць яшчэ і спецыяльны «кантэйнер» для электроннага і электрычнага абсталявання. Батарэйкі, люмінесцэнтныя лямпачкі, мабільныя тэлефоны і падобныя рэчы належаць да небяспечных адходаў, бо змяшчаюць у сабе рэчывы, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе (цяжкія металы, азонаразбуральныя рэчывы і іншае). У Беларусі сістэма збору такіх адходаў ад насельніцтва пачала фарміравацца пасля прыняцця Указа Прэзідэнта ад 11.07.2012 № 313 «Аб некаторых пытаннях абыходжання з адходамі спажывання». Аднак да гэтага часу ў многіх рэгіёнах нашай краіны, асабліва ў невялікіх гарадах, існуюць некаторыя праблемы з тым, каб арганізаваць збор і перапрацоўку электрычнага і электроннага абсталявання. Як сцвярджаюць спецыялісты, акрамя фінансавых цяжкасцяў на гэта ўплываюць яшчэ адсутнасць зацікаўленасці і нізкая інфармаванасць мясцовых жыхароў.

— Прыярытэтнымі кірункамі ў галіне абыходжання

з адходамі электрычнага і электроннага абсталявання з'яўляюцца іх выкарыстанне і абясшкоджванне, — падкрэсліў **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Вадзім ДЗЯМКО.** — Такія адходы часта змяшчаюць у сабе акрамя небяспечных кампанентаў патрэбныя рэсурсы — пластмасу, каштоўныя і іншыя металы і г. д., што робіць іх перапрацоўку прывабнай і спрыяе захаванню прыродных рэсурсаў. Заканадаўчыя акты вызначаюць для сфер гаспадарання парадак патрабаванняў да збору, захоўвання і перадачы на перапрацоўку гэтых відаў адходаў. Хацелася б, каб і насельніцтва, а асабліва моладзь, таксама было ўцягнута ў гэты важны экалагічны працэс.

Ініцыятыва «Стварэнне сістэмы збору адходаў электроннага і электрычнага абсталявання на тэрыторыі Салігорскага раёна Мінскай вобласці» рэалізуецца ў межах праекта «Экаманіторынг», што фінансуецца ЕС, рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды.

Салігорскі раён — найбольш паспяховы з эканамічнага пункту гледжання. Па падліках спецыялістаў, штогод тут утвараецца да 900 тысяч тон адходаў электроннага і электрычнага абсталявання. Аднак сістэма іх збору да гэтага часу знаходзіцца на нізкім узроўні.

— У 2018 годзе мы планавалі сабраць у раёне як мінімум 160 тон адходаў электроннага і электрычнага абсталявання, а ў выніку аб'ёмы не перавысілі і 15 тон — гэта вельмі мала,

у той час як астатнія віды адходаў тут збіраюцца даволі паспяхова, — адзначыла **намеснік старшыні савета БГА «Экалагічная ініцыятыва», кіраўнік ініцыятывы па комплекснай сістэме паасобнага збору адходаў электроннага і электрычнага абсталявання ў Салігорскім раёне Вольга ВОЛКАВА.** — Для параўнання: у Шумілінскім раёне аб'ём збору адходаў ЭЭА на аднаго чалавека ў год складае каля 1,47 кілаграма, у Салігорскім раёне — усяго каля 0,01 кілаграма на чалавека ў год.

Спецыяліст падкрэсліла, што перш чым купіць электроннае і электрычнае абсталяванне, трэба ўважліва вывучыць інфармацыю пра тыя рэчывы, якія яно змяшчае. Зусім нядаўна экалагічнымі лічыліся люмінесцэнтныя лямпачкі. Так, яны дапамагаюць эканоміць электраэнергію, але яшчэ кожная з іх змяшчае да пяці міліграмаў ртуці, якая лёгка можа трапіць у навакольнае асяроддзе, калі лямпачка, напрыклад, разаб'ецца. Ужо даўно прыдумалі больш экадружалюбны варыянт — святлодыёдныя лямпы.

Сетка кантэйнераў, якія ўстанаўліваюцца ў межах ініцыятывы, прызначана спецыяльна для небяспечных адходаў. Гэта значыць, што ртуць-змяшчальныя лямпачкі ў іх не разаб'юцца і ніякія небяспечныя

выпарэнні не будуць выдзяляцца. Таксама, па словах спецыялістаў, у найбліжэйшы час у Салігорску плануецца адкрыццё стацыянарнага пункта збору электроннага і электрычнага абсталявання, куды кожны ахвотны зможа прынесці лямпачкі, батарэйкі і іншае, або за грошы здаць буйнагабарытную тэхніку. Акрамя таго, будзе працаваць перасовачны нарыхтоўчы пункт. Гэта дазволіць збіраць шкодныя адходы ў аддаленых населеных пунктах, ахапіўшы ўсю тэрыторыю раёна. Далейшую транспарціроўку і экалагічна бяспечную перапрацоўку сабраных адходаў будзе забяспечваць прадпрыемства «БелВТІ».

Кацярына КІРЭЕВА, фота аўтара.

Куды здаць непрыдатную для выкарыстання тэхніку?

- Старую тэхніку можна прывезці ў пункт прыёму, які размешчаны ў Мінску па вуліцы Славінскага, 1. Вам заплацяць ад 25 капеек за 1 кілаграм адходаў.
- Для ўтылізацыі буйнагабарытнай тэхнікі можна выклікаць службу «БелВТІ таксі» (праз інтэрнэт або па тэлефонах: 8 (017) 369-83-23, 8 (017) 369-83-63, 8 (029) 626-88-57, кароткі нумар 7383 усіх мабільных аператараў). Служба таксі працуе не па ўсёй Беларусі, азнаёміцца са спісам населеных пунктаў можна на сайце арганізацыі.
- Малагабарытную тэхніку можна здаць у любыя буйныя непрадуктовыя крамы. Для тэлефонаў і іншых гаджэтаў там жа ўсталяваныя «зялёныя» кантэйнеры.
- Куды здаць іншыя віды адходаў, можна даведацца на «Зялёнай карце» greenmap.by або ў аднайменнай мабільнай праграме.

Правила Рекламной игры «Удачный вклад»

1. Настоящая рекламная игра называется **«Удачный вклад»** (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

2. Сведения об организаторе и заинтересованном лице.

Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16.11.2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – организатор).

2.1.1. Юридический адрес и местонахождение организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

2.1.2. Электронная почта организатора: **info@yaskrava.by.**

2.2. Заинтересованным лицом Игры является Открытое акционерное общество «Приорбанк», УНН 100220190 (далее – Заинтересованное лицо).

3. Территория проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Период проведения Игры – с 27.11.2019 г. по 31.03.2020 г., включая период розыгрыша и вручения приза.

5. Состав комиссии по проведению Игры:

5.1. Забиран Инна Александровна, исполнительный директор «Приорбанк» ОАО – председатель комиссии;

5.2. Суходольская Инна Викторовна, специалист по рекламной коммуникации 1-й категории «Приорбанк» ОАО;

5.3. Трудолюбова Наталья Борисовна, экономист 2-й категории «Приорбанк» ОАО;

5.4. Стельмах Александр Петрович, заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа Крама»;

5.5. Красинская Елена Геннадьевна, главный бухгалтер ООО «Яскрава».

6. Игра проводится в целях стимулирования привлечения средств населения в белорусских рублях в безотзывные банковские вклады (депозиты) «Пять звезд: Скала (безотзывный)» и «Выше.net» (безотзывный) (далее – «Вклады») в «Приорбанк» ОАО на срок 7 (семь) месяцев на сумму не менее 3000 (три тысячи) белорусских рублей.

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть физические лица, достигшие 18 лет, – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть участниками Рекламной игры.

8. Состав и размер призового фонда.

Таблица 1

№ п/п	Наименование приза, участвующего в розыгрыше	Наименование приза далее по тексту	Кол-во (шт.)	Сумма за 1 ед., бел. руб. с НДС	Сумма всего, бел. руб.
1	Главный приз – а/м KIA RIO_FB кузов Z94C251AAKR063057	Автомобиль, главный приз	1	30185,00	30185,00
	+ денежная сумма		1	4490,83	4490,83
2	телевизоры LG LED 43LM5700PLA	Телевизор LG	50	840	42000
	+ денежная сумма		50	105,94	5297
3	Мобильный телефон (смартфон) XIAOMI REDMI 7A 2GB/16GB Matte Black EU (M1903C3EG)	Смартфон Xiaomi	450	259,80	116 910
	+ денежная сумма		450	19,25	8662,5

8.1. Призовой фонд Игры составляет 207 545,33 (двести семь тысяч пятьсот сорок пять) белорусских рублей 33 копейки и формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица.

9. Условия участия в Игре.

9.1. Для участия в Игре необходимо в период с 8.00 27.11.2019 г. и не позднее 23.59 26.02.2020 г. включительно (далее – период участия):

– заключить на условиях «Приорбанк» ОАО договор срочного безотзывного банковского вклада (далее – «Договор») на размещение денежных средств во вклад (депозит) «Пять звезд: Скала (безотзывный)» в отделениях «Приорбанк» ОАО, указанных в Таблице 2, и/или во вклад (депозит) «Выше.net» (безотзывный) в мобильном банке Prior Online или интернет-банке Prior Online сроком на 7 месяцев на сумму не менее 3000 белорусских рублей.

– внести денежные средства во Вклад (депозит);

– не расторгать Договор вклада до проведения розыгрыша призов по Рекламной игре;

– при заключении Договора дать согласие на участие в Игре.

Таблица 2

Наименование	Адрес подразделения
Центр банковских услуг (далее – ЦБУ 100)	г. Минск, улица Радиальная, 38А
Удаленное рабочее место (далее – УРМ) 100/1	г. Минск, проспект Партизанский, 182
УРМ 100/2	г. Минск, проспект Дзержинского, 126
УРМ 100/5	г. Минск, проспект Рокоссовского, 80
УРМ 100/9	г. Минск, улица Горецкого, 2
УРМ 100/10	г. Минск, улица Городецкая, 30
УРМ 100/11	г. Минск, улица Игуменский тракт, 30
УРМ 100/12	г. Минск, проспект Партизанский, 150А
ЦБУ 101	г. Минск, улица Тимирязева, 65А
УРМ 101/2	г. Минск, проспект Победителей, 125
УРМ 101/3	г. Минск, улица Притыцкого, 30А
УРМ 101/5	г. Минск, улица Свердлова, 23
УРМ 101/7	г. Заславль, улица Советская, 92А
ЦБУ 102	г. Минск, улица Логойский тракт, 15/1
ЦБУ 104	г. Солигорск, улица Богомолова, 16а
УРМ 104/1	г. Солигорск, улица Козлова, 37
ЦБУ 107	г. Молодечно, улица Великий Гостинец, 143
УРМ 109/1	г. Минск, улица Притыцкого, 91
ЦБУ 111	г. Минск, проспект Машерова, 40
УРМ 111/1	г. Минск, улица Макаенка, 23
ЦБУ 112	г. Борисов, улица Гагарина, 101А
УРМ 112/2	г. Жодино, проспект Ленина, 22
ЦБУ 113	г. Минск, улица Комсомольская, 13
УРМ 113/3	г. Минск, улица Немига, 30
ЦБУ 114	г. Минск, проспект Партизанский, 56/2
УРМ 114/1	г. Минск, проспект Партизанский, 107
УРМ 114/2	г. Сморгонь, улица Советская, 25В
ЦБУ 115	г. Минск, улица Кропоткина, 91
ЦБУ 116	г. Минск, улица Казинца, 92/1
ЦБУ 117	г. Минск, проспект Независимости, 172
УРМ 117/1	г. Минск, проспект Независимости, 168/2
ЦБУ 118	г. Минск, улица Сурганова, 41
ЦБУ 119	г. Минск, проспект Дзержинского, 104
УРМ 119/1	г. Минск, проспект Дзержинского, 122
ЦБУ 200	г. Витебск, улица Толстого, 3
УРМ 200/1	г. Витебск, проспект Фрунзе, 85
УРМ 200/5	г. Витебск, проспект Строителей, 11А
УРМ 200/6	г. Витебск, площадь Смоленская, 10
ЦБУ 201	г. Орша, Базарная площадь
ЦБУ 202	г. Полоцк, улица Евфросинии Полоцкой, 1А
УРМ 202/1	г. Новополоцк, улица Молодежная, 213
УРМ 202/6	г. Поставы, площадь Ленина, 23/2
ЦБУ 300	г. Могилев, улица Первомайская, 63
УРМ 300/4	г. Кричев, микрорайон Сож, 5
ЦБУ 301	г. Бобруйск, улица Социалистическая, 84
УРМ 301/2	г. Осиповичи, улица Сумченко, 49/3
ЦБУ 400	г. Гомель, улица Красноармейская, 3А
УРМ 400/2	г. Речица, улица Советская, 43
ЦБУ 401	г. Мозырь, улица Интернациональная, 162
УРМ 401/1	г. Калинковичи, улица Фрунзе, 3
ЦБУ 402	г. Жлобин, микрорайон 16, 24А
ЦБУ 500	г. Брест, бульвар Шевченко, 6/1
УРМ 500/3	г. Кобрин, улица Октябрьская, 7
ЦБУ 501	г. Белоозерск, улица Ленина, 48А
УРМ 501/1	г. Береза, улица Красноармейская, 26
УРМ 501/2	г. Иваново, улица 17 Сентября, 2
ЦБУ 505	г. Барановичи, улица Ленина, 71
ЦБУ 506	г. Пинск, улица Ленина, 7
УРМ 506/1	г. Столин, улица Ленина, 10
ЦБУ 600	г. Гродно, улица Мостовая, 37
УРМ 600/1	г. Гродно, улица О. Соломовой, 137
УРМ 600/2	г. Гродно, проспект Космонавтов, 81
УРМ 600/4	г. Гродно, улица Дубко, 17
ЦБУ 602	г. Лида, улица Победы, 30
УРМ 602/1	г. Новогрудок, улица Карского, 1А
УРМ 602/2	г. Ошмяны, улица Советская, 75
ЦБУ 603	г. Волковыск, улица Советская, 14
УРМ 603/1	г. Слоним, улица Янки Купалы, 4

9.2. При наличии у одного физического лица более одного Договора, соответствующего условиям Игры, каждый из этих Договоров принимает участие в розыгрыше призового фонда.

9.3. Совершая действия для участия в Игре, участник дает согласие Организатору на использование персональных данных участника, в том числе их обработку и проверку, в рамках данной Игры.

9.4. Не являются основанием для участия в Игре – нарушение участником условий, установленных п. 9.1 Правил, в т. ч. (но не ограничиваясь):

– невнесение денежных средств во вклад (депозит);

– заключение Договоров на сумму менее 3000 белорусских рублей;

– заключение Договоров ранее или позднее периода, указанного в п. 9.1 Правил;

– заключение Договоров на условиях, отличающихся от предложенных в Правилах.

– заключение Договоров на имя другого лица.

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.

Всего за период проведения Игры Организатором проводится 1 (один) розыгрыш призового фонда – 03.03.2020 г. в 16.00. Место проведения розыгрыша призов – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8. Правил в Таблице 1.

Для осуществления розыгрыша формируется один список, включающий порядковые номера, дату заключения Договора, фамилию, имя, отчество Участника. Порядковые номера (далее – «номера») присваиваются участникам в хронологическом порядке согласно дате заключения Договора, а при совпадении даты – в алфавитном порядке по фамилии, имени, отчеству Участника, формируя массив участников (далее – «массив»).

Для определения выигрышных номеров для всех призов Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) по 9 (девять).

10.5. Определение выигрышного номера происходит путем его формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

10.6. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Организатор извлекает из барабана один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

10.7. Далее в лототрон загружаются все 10 (десять) шаров, шары перемешиваются и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве.

10.8. Определение победителей призов происходит следующим образом:

10.8.1. Определение победителей призов «Смартфон Xiaomi». Выигравшим приз считается первый номер участника, определенный согласно п.п. 10.4 – 10.7 Правил и каждый 3-й номер, следующий за ним в списке, в количестве 449 номеров. Если список завершается, расчет продолжается далее с начала списка. Всего разыгрывается 450 призов «Смартфон Xiaomi».

10.8.2. Определение победителей призов «Телевизор LG». Выигравшим приз считается номер Участника, определенный согласно п.п. 10.4 – 10.7 Правил и каждый 3-й номер, следующий за ним в списке, в количестве 49 номеров. Если список завершается, расчет продолжается далее с начала списка. Всего разыгрывается 50 призов «Телевизор LG».

10.8.3. Определение победителей призов «Автомобиль». Выигравшим приз «Автомобиль» считается номер Участника, определенный согласно п.п. 10.4 – 10.7 Правил.

10.9. После определения победителя приза «Автомобиль» для обеспечения полной выдачи приза «Автомобиль» Организатор осуществляет определение 1 (одного) резервного победителя. Резервный победитель определяется в соответствии с п.п. 10.4 – 10.7 Правил.

10.10. В случае если номер Участника, определенный согласно п.п. 10.4 – 10.7 Правил совпадает с одним из зафиксированных ранее выигрышных номеров, выигрышным считается номер, следующий за этим номером.

10.11. Участник может стать победителем только один раз в ходе проведения розыгрыша.

11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.

11.1. В срок по 10 марта 2020 г. (включительно) Организатор уведомляет Победителей о выигрыше по почте заказным письмом на адрес регистрации, указанный при оформлении договора с Банком, а также по электронной почте (при ее наличии) и/или по номеру телефона, в том числе путем направления SMS-сообщения.

11.2. Победитель может получить выигранный им приз следующим образом:

11.2.1. Для Победителя Главного приза, а также Победителей призов Телевизор LG и Смартфон Xiaomi, **проживающих в г. Минске** или **не проживающих в г. Минске, но желающих получить Приз путем самовывоза** по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 907, явиться в срок до 20 марта 2020 г. (включительно) с 10.00 до 17.00 в рабочие дни и с 10.00 до 13.00 в субботу, предварительно связавшись с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты **info@yaskrava.by,** и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках игры (Ф. И. О., серия и номер паспорта (вида на жительство в Республике Беларусь), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство в Республике Беларусь), идентификационный номер, адрес регистрации).

11.2.2. Для Победителей, **проживающих не в г. Минске (за исключением получения Главного приза):** не позднее срока до 20 марта 2020 г. (включительно) связаться с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты **info@yaskrava.by** и отправить по адресу электронной почты **info@yaskrava.by** до 20.03.2020 г. отсканированную копию документа, указанную в п. 11.2.1. Правил.

После получения вышеуказанных копий документа Организатор не позднее 20 марта 2020 г. (включительно) осуществляет за счет собственных средств доставку (почтой, курьерской службой, служебным транспортом и т. д.) призов победителям, проживающим не в г. Минске, по адресу, указанном победителем для доставки приза. Датой выдачи приза является дата отправки приза Победителю.

11.3. Если Победитель не может получить приз лично, приз может получить в установленные в п. 11.2 Правил сроки его законный представитель (доверенное лицо), уведомив об этом Организатора не позднее 20 марта 2020 г. по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты **info@yaskrava.by.** При передаче приза доверенное лицо обязано предоставить лично Организатору:

– доверенность от победителя на получение приза, заверенную нотариально;

– документ, указанный в п. 11.2.1 Правил.

11.4. Приз «Автомобиль» вручается Резервному Победителю в случае, если основной Победитель:

– отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

– нарушает (не выполняет) условия Правил (в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в порядке, установленные Правилами, отказывается от подписания необходимых документов);

– не является для получения приза в сроки, установленные Правилами.

11.5. В срок до 24 марта 2020 г. (включительно) Организатор уведомляет Резервного Победителя о выигрыше по почте заказным письмом на адрес регистрации, указанный при оформлении договора с Банком, а также по электронной почте (при ее наличии) и/или по номеру телефона, в том числе путем направления SMS-сообщения.

11.6. Резервный Победитель может получить выигранный им приз следующим образом:

11.6.1. Путем самовывоза по адресу г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 907, явиться в срок до 31 марта 2020 г. (включительно) с 10.00 до 17.00 в рабочие дни и с 10.00 до 13.00 в субботу, предварительно связавшись с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты **info@yaskrava.by,** и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках игры (Ф. И. О., серия и номер паспорта (вида на жительство в Республике Беларусь), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство в Республике Беларусь), идентификационный номер, адрес регистрации).

11.6.2. Если Резервный Победитель не может получить приз лично, приз может получить в установленные сроки в п. 11.6.1 его законный представитель (доверенное лицо), уведомив об этом Организатора не позднее 31 марта 2020 г. по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты **info@yaskrava.by.** При передаче приза доверенное лицо обязано предоставить лично Организатору:

– доверенность от победителя на получение приза, заверенную нотариально;

– документ, указанный в п. 11.6.1 Правил.

11.7. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

11.8. При получении приза Победитель (Резервный Победитель) несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза, дополнительной денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

11.9. В случае если основной победитель (резервный победитель), претендующий на получение приза, не обеспечивают соблюдение условий Правил (в т.ч. предусмотренных п.п. 11.2 и 11.3), а также наступления обстоятельств, предусмотренных в п.п. 11.1 Правил, в результате чего теряют право получения Приза, Приз остается в распоряжении Организатора.

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, Участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением приза.

12.2. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору.

12.3. Победитель (резервный победитель), претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения приза.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты розыгрыша Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 26.03.2020 г.

14.Общие положения.

14.1. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, будут считаться окончательными и распространяться на всех участников.

14.2. Банк и любые его аффилированные лица (за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры), не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

14.3. Организатор не несет ответственность, если не по его вине у участника отсутствует доступ к сети интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет), электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с участником и т. д.), почтовой службы (сроки доставки и т. д.). Организатор не компенсирует участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении офиса Организатора.

14.4. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375 (33) 696-17-16 с 10.00 до 18.00 в рабочие дни и с 11.00 до 14.00 в выходные дни, по электронной почте **info@yaskrava.by.**

Свидетельство № 3686
о государственной регистрации рекламной игры
выдано 21 ноября 2019 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

А музыка вечная

ШМАТ ЦІКАВЫХ ГАЛАСОЎ

Паабяцалі гледачам арганізатары XXXII Міжнароднага фестывалю «Студзеньскія музычныя вечары»

Здавалася б, толькі нядаўна апусцілася заслона вераснёўскага фестывалю «Белая вежа» ў Брэсце, а ўжо «Вечары» на парозе — студзеньскія. І праўда, застаўся нейкі месяц да свята класічнай музыкі, таму арганізатары і склікалі прэс-канферэнцыю. Утваральнікі форуму засталіся ранейшыя, а вось удзельнікі, як нам сказалі, будуць спрэс новыя.

Заснавальнік, дырэктар і галоўны рэжысёр фестывалю, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За развіццё міжнародных культурных сувязяў» Лілія БАТЫРАВА чатыры гады таму адзначыла сваё 80-годдзе, але ўзрост ёй не перашкода. Лілія Рыгораўна вядзе перагаворы з самымі рознымі зоркамі музычнага мастацтва, ездзіць на конкурсы і фестывалі, дзе знаходзіць будучых удзельнікаў зімовага фэсту. Так было і цяпер, калі рыхтаваўся сёлетні фестываль — трыццаць другі па ліку.

Да пачатку брыфінгу заставалася крыху часу, і Лілія Батырава згадзілася адказаць на пытанні карэспандэнта «Звязды».

— Лілія Рыгораўна, з чаго ўсё пачыналася, як нарадзілася ідэя праводзіць міжнародныя фестывалі класічнай музыкі, і не ў сталіцы, а ў Брэсце? Тым больш што ў канцы 80-х стаў адчувальным дэфіцыт усяго, у тым ліку сродкаў...

— Ну, не адразу ўзнік фестываль. Колькі сябе памятаю, заўсёды працавала, вучыла дзяцей музыцы ў сваім каледжы. А каб дзеці маглі пачуць ужывую і душой адчуць высокую музыку, па магчымасці запрашала яе майстроў. Так арганізоўваліся канцэрты, завязваліся знаёмствы. З часам усё гэта перарасло ў фестываль. І на нашым фэсце пабывалі ўжо дзясяткі оперных зорак сусветнага маштабу.

— Адкуль вы чэрпаеце энергію на такую вялікую работу?

— Вядома, ад гледачоў, аматараў сапраўднай музыкі. Уявіце сабе, іду па плошчы Леніна 6 верасня пасля ўрачыстага адкрыцця святкавання 1000-годдзя Брэста, а да мяне падыходзяць людзі і пытаюць: «Скажыце, а ў студзені фестываль будзе?» Кажу: «Вядома, будзе». Аказваецца, людзі непакоіліся, што ў сувязі з вялікімі святкаваннямі можа не хапіць сродкаў альбо сіл на арганізацыю «Вечароў». Больш за тое скажу: у нас у горадзе ёсць каля дзясятка сем'яў пенсіянераў, якія з кожнай пенсіі адкладваюць пэўную суму грошай, каб наведаць усе канцэрты фестывалю. Ну хіба можна нейкім чынам падмануць іх спадзяванні?!

Ёсць усе падставы чакаць, што і гэтым разам мы адчуем сапраўдную асалоду класічнай музыкі. Афіша фестывалю разнастайная і цікавая. Выступяць удзельнікі з 10 краін: Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Польшчы, Грузіі, Літвы, Кітая, ЗША, Нідэрландаў. Магчыма, і з Італіі, пакуль ідуць перагаворы і ўзгадненні.

«Гэтым разам удалося запрасіць многа цікавых галасоў, будзе аж 12 вакалістаў, такога ніколі не было. З іх многія выступяць на фестывалі ўпершыню, — паведаміла арганізатар форуму на прэс-канферэнцыі. — Напрыклад, Тарас Штонда, бас, зорка сусветных оперных тэатраў, саліст Нацыянальнай оперы Украіны. Будзе таксама лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў брастаўчанка Аляксандра Момінава, сапрана. Хачу прапанаваць ім заспяваць дуэтам, і гэта можа стаць прыемным сюрпрызам фестывалю», — падзялілася даволі смелымі планамі яго дырэктар.

Да яго сюрпрызаў, відаць, можна аднесці і выступленне зусім юных піяністак з Літвы Каі і Клеі Кашубайтэ. Дзяўчынкам 9 і 11 гадоў, але іграюць яны чароўна, паводле слоў Ліліі Батыравай. Яна пачула іх у Вільнюсе, там і запрасіла.

Цікавым абяцае стаць выступленне саліста опернай трупы Паўночнай Амерыкі і Еўропы, саліста Балтыморскага опернага хору барытона са Злучаных Штатаў Амерыкі Альберта Нідэля. Як і трыа кампазітара і лаўрэата міжнародных конкурсаў з Польшчы Канстанціна Віленскага (фартэпіяна), дырэктара Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы Алега Роўды (ударныя інструменты) і лаўрэата міжнародных конкурсаў Вячаслава Пляско з Брэста (кантрабас). Яны выступяць у суправаджэнні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава.

